

ЯК БЕЛАРУСКАМУ РУБЛЮ ПЕРАЖЫЦЬ КАРАНАВІРУС 4

ГЛЕБЫ КІСЛЫЯ ЦІ КАРЫСНЫЯ 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 ЛЮТАГА 2020 г. АЎТОРАК № 22 (29136)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід ЗАЯЦ, старшыня Магілёўскага аблвыканкама:**

*«Часам не трэба даводзіць сітуацыю да ўлад або суда. І ў рабочых пытаннях, і ў жыццёвых трэба спрабаваць пагаварыць і дамовіцца. Асабліва суседзям, якія не першы год жывуць побач. Чалавечае стаўленне адно да аднаго — адна з асноў цывілізаванага жыцця. Але часам бываюць моманты, у якіх бяссільныя і людзі, і мясцовыя ўлады. Тады шукаць справядлівасць трэба толькі ў судовым парадку».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Вы прыехалі ў нармальную краіну, дзе жыве нармальны народ, і краіна гатова працаваць на стабільнасць і мір»



Фота БелТА.

### У дзяржсакратара ЗША пасля візіту ў Мінск не павінна было застацца сумненняў у гэтых словах беларускага Прэзідэнта

**«У нас дыктатура адрозніваецца тым, што ўсе адпачываюць у суботу і нядзелю, а Прэзідэнт працуе». З такога жарту Аляксандра Лукашэнкі пачаліся афіцыйныя перагаворы Прэзідэнта Беларусі і дзяржаўнага сакратара Злучаных Штатаў Амерыкі Майкла Пампеа, які ў суботу з афіцыйным візітам наведаў Мінск. Упершыню з 1994 года, калі ў беларускай сталіцы пабываў Біл Клінтан, амерыканскі палітык такога высокага ўзроўню прыязджае з афіцыйным візітам у Беларусь. Сустрэча з Майклам Пампеа першапачаткова была запланавана на 4 студзеня, але з-за нападу на амерыканскае пасольства ў Іраку адмянілася. Візіт у Мінск — частка вялікага еўрапейска-азіяцкага турнэ дзяржаўнага сакратара ЗША, якое складаецца з наведвання Вялікабрытаніі, Украіны, Беларусі, Казахстана, Узбекістана.**

СТАР. 2

# Экзамен для пісьменнікаў, свята для чытачоў

**Больш за 500 мерапрыемстваў пройдзе падчас XXVII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, якая пачне работу ўжо заўтра: каля 300 з іх пройдуць у выставачным павільёне на праспекце Пераможцаў, 14, астатнія — у кнігарнях сталіцы, Нацыянальным гістарычным музеі, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ды іншых бібліятэках, у тым ліку вышэйшых навучальных устаноў. Пра гэта расказаў міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.**

— Ганаровым госцем кніжнай выстаўкі-кірмашу стане Расійская Федэрацыя, галоўным экспанентам — ЗША. Мы ўдзячны, што да нас прыедуць шматлікія аўтары з розных краін, у прыватнасці вядомыя расійскія пісьменнікі Мікалай Чаркашын, Таццяна Усцінава, Мікалай Далгаполаў, Аляксандра Марыніна. Яны і іншыя літаратары возьмуць удзел у VI Міжнародным сімпозіуме «Пісьменнік і час», які адбудзецца ў рамках выстаўкі. Безумоўна, вялікую цікавасць выклікаюць і іншыя мерапрыемствы. Напрыклад, сумесны праект «Белпошты» з «Поштай Расіі», падчас якога пройдзець майстар-класы па складванні пісем у легендарныя франтавыя трыкутнікі. У дні выстаўкі кожны ахвотны зможа даслаць паштоўку з памятным штэмпелем і выявай сімволікі 75-годдзя Вялікай Перамогі.

СТАР. 5



Фота Кастуся ДРОБАВА.

## КОРАТКА

- Міністры замежных спраў Беларусі і Літвы Уладзімір Макей і Лінас Лінкявічус правялі 3 лютага сустрэчу ў аграгарадку Рымдзюнах Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці.
- **Мінсувязі выпусціць марку да 100-годдзя Андрэя Макаёнка.**
- БРСМ і Еўрапейская асацыяцыя маладзёжных картаў падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве.
- **Укараненне безнаяўнай аплаты праезду ў наземным транспарце Мінска адкладваецца.**
- Беспрацоўных мінчан запрашаюць 4-6 лютага на міні-кірмашы вакансій.
- **У Віцебску адкрыецца выстаўка работ народных умельцаў да 75-годдзя Вялікай Перамогі.**
- У Буда-Кашалёўскім і Лунінецкім раёнах вяскоўцы на сваіх падворках знайшлі па мінамётнай міне часоў вайны.
- **У Маладзечне работніца салона сотавай сувязі прысвойвала тэлефоны, аформленыя на кліентаў.**
- У краіне стартаваў конкурс «Найлепшы экспарцёр».

# ЧЫТАЦЬ КНІГІ — ГЭТА МОДНА!




**Прынамсі, у Чавускім раёне Магілёўшчыны і загадчык гарадской дзіцячай бібліятэкі Таццяна ФІЛІПЕНКА, і бібліятэкар Наталля КОТ гатовы гэта пацвердзіць. Аб тым, як жыве бібліятэчная сістэма ў глыбінцы, чытайце на 13-й старонцы.**

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

ISSN 1990 - 763X

# «Вы прыехалі ў нармальную краіну, дзе жыве нармальны народ, і краіна гатова працаваць на стабільнасць і мір»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Падчас сустрэчы палітыкі неаднойчы разбаўлялі размову трапнымі выслоўямі. Напрыклад, кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Амерыкі заявіў, калі журналісты пакідалі залу перагавораў, што вельмі іх любіць асабліва, калі яны сыходзяць. На гэта наш Прэзідэнт адзначыў, што прэсу ў Беларусі называюць чацвёртай уладай, але параіў ім не забываць, што ёсць першая. Ды і ўвогуле, сустрэча прайшла ў пазітыўнай, даверлівай атмасферы, хоць гаварылася на ёй аб сур'ёзных, важных рэчах.**

## Архітэктура сучаснай палітыкі

На пачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка адразу настроіў размову на канструктыўны лад, падкрэсліўшы, што гатовы шчыра адказаць на пытанні, якія існуюць у істэблішменту Злучаных Штатаў. ***«Вы павінны ведаць, што вы прыехалі ў нармальную краіну, дзе жыве нармальны народ, і краіна гатова працаваць на стабільнасць і мір, прынамсі, у гэтым рэгіёне»***, — заўважыў Прэзідэнт Беларусі.

За адзін дзень Майкл Пампеа не зможа знайсці адказы на ўсе пытанні, але на адно адказ відавочны: Беларусь — міралюбная краіна. «Уся краіна (падчас Вялікай Айчыннай вайны. — ***«Зв.»***) была пакрыта канцлагерамі, яўрэйскімі гета. Кожны трэці чалавек загінуў — гэта кажа само за сябе. Таму і гісторыя, і менталітэт нашага народа абсалютна міралюбныя. Я ўпэўнены, што нават за кароткі прамежак часу знаходжання ў Беларусі вы гэта адчуеце», — звярнуўся да амерыканскага госця Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў, што ён даўно завочна знаёмы з дзяржсакратаром Пампеа. Беларусы разам з амерыканцамі праводзілі сумесныя мерапрыемствы спецслужбаў супраць тэрарызму, гандлю людзьмі. Гэта было ў тыя часы, калі Майкл Пампеа ўзначальваў ЦРУ.

***«Мы правялі некалькі сур'ёзных аперацый па супрацьдзеянні распаўсюджванню ядзерных элементаў. На мяжы з Беларуссю разам затрымалі злачынцаў, якія перамяшчалі цераз мяжу ядзерныя матэрыялы ў бок Захаду»***, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка пра сумесную работу, назваўшы яе вельмі важнай для людзей.

## Вяртанне пасольства

Майкл Пампеа паабяцаў павялічыць узровень двухбаковых адносін, і сказаў, што ў найбліжэйшы час будзе прызначаны пасол ЗША ў Беларусі.

«І вы ўбачыце, што робіцца ўсе намаганні добрай волі на палітычным, дыпламатычным і іншых узроўнях. І мы працуем над тым, каб забяспечыць эканамічнае развіццё, каб амерыканскія прадпрыемствы былі тут, каб людзі рабілі адпаведны ўнёсак у развіццё сваёй супольнасці, стварэнне рабочых месцаў. І мы гатовы падтрымаць вас у гэтым кірунку», — запэўніў Майкл Пампеа.

Ён адзначыў, што высока цэніць сумесную работу з Беларуссю па барацьбе з тэрарызмам і спадзяецца на далейшае развіццё гэтых стасункаў.

***«Мы разумеем, што ў вас доўгая гісторыя адносін з Расіяй. Але мы не гаворым аб выбары паміж намі і імі»***, — звярнуў увагу Майкл Пампеа.

## Нафта з другога берага Атлантыкі

Візіт дзяржсакратара ў Беларусь, па словах **міністра замежных спраў Уладзіміра МАКЕЯ**, — сведчанне інтэнсіфікацыі двухбаковага ўзаемадзеяння, якое надасць імпульс працэсу паступовай нармалізацыі адносін.



Фота БелТА.

Як адзначыў Уладзімір Макей, размова госця з Прэзідэнтам прайшла ў атмасферы даверу і разумення: ***«Па шэрагу кірункаў падыходы і інтарэсы супадаюць або пераклікаюцца. Адзначана палітычная воля бакоў і далей развіваць двухбаковыя адносіны.*** Гэтаму будзе спрыяць вяртанне паслоў у сталіцы дзвюх краін пасля 12-гадовага перапынку».

Асаблівы акцэнт краіны зробяць на супрацоўніцтве праваахоўных органаў дзеля рэгіянальнай бяспекі.

«У прыватнасці, адбыўся абмен меркаваннямі пра сітуацыю ў рэгіёне і перспектывы ўзаемадзеяння Беларусі з блокам НАТА», — дадаў беларускі міністр.

Майкл Пампеа нагадаў, што ЗША ў 1991 годзе былі адной з першых краін, якія прызналі незалежнасць Беларусі, і сёння таксама зыходзіць з гэтых пазіцый.

Урад Беларусі падпісаў дагаворы з Міністэрствам абароны ЗША, ФБР, Агенцтвам па барацьбе з гандлем наркотыкамі. ***«Гэта палепшыць сумесную работу ў такіх галінах, як бяспека граніц, кібербяспека, барацьба з незаконным абарачэннем наркотыкаў.*** Мы спадзяёмся, што такое супрацоўніцтва пашырыцца ў найбліжэйшы час. Мы таксама правялі доўгую размову аб эканамічных пытаннях», — расказаў Майкл Пампеа.

***Вытворцы энергарэсурсаў з Амерыкі гатовы забяспечыць Беларусь неабходнай нафтай на 100 % па канкурэнтных цэнах. «Мы найбуйнейшы вытворца энергарэсурсаў у свеце. І ўсё, што трэба вам, — сказаць і звярнуцца да нас»***, — запэўніў Майкл Пампеа.

Размаўлялі за зачыненымі дзвярыма і аб уступленні Беларусі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, прагрэсе краіны ў дэмакратычных рэформах.

## Разам за мір ва Украіне

Майкл Пампеа таксама абмеркаваў з Аляксандрам Лукашэнкам і Уладзімірам Макеем урэгуляванне канфлікту ва Украіне.

«Мы актыўна ўдзельнічаем у забеспячэнні адпаведнага, правільнага выйсця (з канфлікту. — ***«Зв.»***). Тут таксама прайшлі сустрэчы ў нармандскім фармаце. Гэта яскрава тое пытанне, у вырашэнні якога неабходна ўдзельнічаць усёй Еўропе, усяму свету, — сказаў дзяржсакратар. — У выніку Расія, Украіна павінны самі вырашыць гэтае пытанне».

Уладзімір Макей чарговы раз агучыў беларускую пазіцыю па Украіне, адзначыўшы, што наша краіна будзе рабіць усё, каб хутчэй скончыўся крызіс: ***«Мы падтрымліваем любыя фарматы (у тым ліку з удзелам ЗША), калі яны толькі дапамогуць у вырашэнні крызісу ва Украіне»***.

## Рушым да адмены санкцый

У журналістаў пасля перагавораў была магчымасць задаць некалькі пытанняў міністрам. Беларускія рэпарцёры атрымалі адказ на пытанне аб Украіне, а іх амерыканскія калегі пацікавіліся назначэннем паслоў і зняццем санкцый.

***«Мы будзем разглядаць, якія санкцыі можна зняць і ў выніку чаго. Але пакуль мы да гэтага пункта не дайшлі. Такія моманты, як сёння, набліжаюць нас да гэтай мэты»***, — паведаміў дзяржсакратар ЗША.

Па яго словах, пасол будзе назначаны ў найбліжэйшы час: ***«Мы спадзяёмся, не так шмат часу пройдзе, пакуль мы назначым пасла.*** Дыпламатычныя адносіны палепшыліся, колькасць дыпламатаў амаль падвоілася — гэта ўжо карысна для ЗША і Беларусі».

Уладзімір Макей звярнуў увагу, што наша краіна зацікаўлена ў тым, каб амерыканскі бізнес актыўна працаваў тут, развівалася супрацоўніцтва паміж урадамі. Адчувальныя для Злучаных Штатаў Амерыкі сферы дэмакратыі і правоў чалавека таксама дэталёва абмяркоўваліся.

«Беларусь, магчыма, не з'яўляецца абсалютна ідэальнай краінай у гэтым плане. Мы разумеем, што мы павінны рэалізоўваць рэформы ў той ці іншай сферы. У тым ліку і ў сферы ўдасканалення правоў чалавека», — канстатаваў міністр замежных спраў Беларусі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Сфера інтарэсаў

# БУДУЧЫНЯ НА МІЛЬЯРДЫ ДОЛАРАЎ



Фота БелТА.

**ІТ-тэхналогіі павінны стаць адным з галоўных складнікаў новай эканамічнай мадэлі краіны. Гэтае меркаванне прагучала ў Парку высокіх тэхналогій падчас круглага стала на тэму развіцця ІТ-індустрыі, перспектыў лічбавізацыі фінансавай сферы краіны. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах, прадстаўнікі Нацыянальнага банка, Міністэрства фінансаў.**

**Дырэктар адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Усевалад ЯНЧЭЎСКІ** адзначыў, што паміж ІТ-супольнасцю і парламентам наладжаны вельмі добры дыялог.

— Тое, што было разумна, актуальна сёння, літаральна заўтра, праз год, два, тры, асабліва гэта датычыцца сферы тэхналогій, ужо састарэла, трэба нешта новае. Дзякуючы вядомым рашэнням, якія ў свой час прыняў кіраўнік дзяржавы, Беларусь стала піянерам, прычым не толькі ў рэгіёне, але і ва ўсім свеце, — у заканадаўстве, якое датычыцца ІТ-сферы. Сёння трэба зрабіць так, каб мы не толькі не адставалі, а апярэджвалі сусветныя заканадаўчыя навацыі, якія рэгулююць сферу высокіх тэхналогій.

У 2017 годзе Прэзідэнт падпісаў Дэкрэт "Аб развіцці лічбавай эканомікі". Згадваючы яго, Усевалад Янчэўскі прызнаўся: удзельнікі ІТ-рынку за яго вельмі ўдзячныя. Па словах дырэктара ПВТ, пераважнне пакалкаў тут ідзе пастаянна і лёгка. Гэта вынік таго, што бізнес адчувае сябе ўпэўнена.

— На большасць кампаній уплыў аказала атмасфера, гэта стала стымулам для стварэння новых — іх становіцца ўсё больш і больш. Прэзідэнт не проста падпісаў дакумент, ён удыхнуў у іх упэўненасць. І ў гэтых невялікіх кампаніях будучыня — будучыня на мільярды долараў.

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерый МІЦКЕВІЧ** упэўнены, што сёння наспела неабходнасць больш актыўна ўкараняць лічбавыя тэхналогіі і ў іншыя сферы, а для гэтага трэба трансфармаваць заканадаўства.

— Многія законапраекты, якія сёння ўжо знаходзяцца на разглядзе ў парламенце, у той ці іншай ступені ўтрымліваюць розныя нормы, якія рэгулююць ІТ-сферу. Напрыклад, законапраект «Аб персанальных даных». Таму што любая добрая справа, любая тэхналогія нясе як карысць, так часам і шкоду. І вядома, мы павінны стымуляваць карыснае развіццё і, адпаведна, заканадаўча адрэгуляваць праблему такім чынам, каб мінімізаваць любую шкоду, — зазначыў спікер.

І дадаў, што дэпутаты могуць падтрымаць укараненне ІТ на дзяржаўных прадпрыемствах. Дзяржаўны сектар у гэтым плане не адстае ад прыватнага. «Усё залежыць ад патрэб, жадання і імкнення канкрэтных прадпрыемстваў, іх менеджараў. Тэхналогіі паскараюць, робяць таннейшым вытворчы працэс, любы менеджар павінен імкнуцца да таго, каб укараняць іх. Калі ёсць патрэба ў стымулюючых заканадаўчых рашэннях, то мы гэта можам абмеркаваць. Калі будуць такія ідэі, мы іх разгледзім».

**Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ** прывёў у прыклад праект закона «Аб аплатных сістэмах і аплатных паслугах»:

— Дакумент кардынальна змяняе канфігурацыю развіцця фінансавага рынку з пункту гледжання рэгулявання. Цяпер мы рэгулюем суб'екты, а з яго прыняццем будзем рэгуляваць дзейнасць, адкрываючы шлях канкурэнцыі. Гэта прывядзе да росту якасці, тэхналагічнасці, а ў канчатковым выніку выйграюць спажыўцы.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Людміла НІЖЭВІЧ** звярнула ўвагу, што ўсе высокія тэхналогіі, якія існуюць у свеце і краіне, хутчэй за ўсё ўкараняюцца менавіта ў фінансавую сферу. «Калі так адбываецца, гэта, хочаш ці не, падштурхоўвае ўсе іншыя галіны да таго, каб яны таксама рэагавалі на ўсе навіны. Такі працэс запатрабуе неаднаразовага ўмяшання, у тым ліку з боку заканатворчасці», — упэўнена яна.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ПРАВЕРКА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Ва Узброеных Сілах Беларусі ў самым разгары — комплексная праверка. Ідзе паступовае нарошчванне складу прыцягваемых войскаў. Пра гэта паведамляе Міністэрства абароны.**

З панядзелка шэраг воінскіх часцей і падраздзяленняў ВПС і войскаў ППА прыводзяцца ў гатоўнасць да выканання задач па прызначэнні. Састаў дзяжурных сіл па проціпаветранай абароне ўзмоцніцца зенітнымі ракетнымі дывізіёнамі С-300, «Бук», «Аса». Авіяцыі трэба будзе выканаць задачы па разгрупаванні часткі сіл і сродкаў з задзейнічаннем аэрадромаў Баранавічы, Мачулішчы, Бабруйск, Лунінец, Бараўцы.

Падраздзяленні механізаваных брыгад завяршылі выхад камбінаваным спосабам у раёны выканання вучэбна-баявых задач і прыступілі да выканання пастаўленых задач. Некаторыя з іх прадугледжвалі баявую стральбу ў начны час. Каб падраздзяленні 19-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады пераадолелі водную перашкоду, сіламі 7-га інжынернага палка ў самыя кароткія тэрміны наведзеная маставая пераправа цераз Бярэзіну. Шэраг часцей і падраздзяленняў, якія прымалі ўдзел у праверцы, паспяхова выканаўшы пастаўленыя задачы, вяртаюцца ў пункты пастаяннай дыслакацыі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

На слыху

Уладзімір КАРАНІК:

# «ПРАШУ АДНЕСЦІСЯ СПАКОЙНА»

## У Беларусі медыкі праводзяць трэніроўкі і іншыя мерапрыемствы, каб прадухіліць пранікненне і распаўсюджванне каранавіруса



**Каранавіруса ў Беларусі пакуль няма, і робіцца ўсё магчымае, каб не дапусціць яго пранікнення і распаўсюджвання. Пяць беларусаў, якія разам з грамадзянамі Казахстана былі ў нядзелю эвакуіраваны з кітайскай правінцыі Ухань, размешчаны ў шпіталі ў Нур-Султане і будуць знаходзіцца там на працягу ўсяго каранціннага перыяду. Пра гэта расказаў падчас адкрыцця мікрабіялагічнай лабараторыі пры раённым цэнтры гігіены і эпідэміялогіі ў Шклове міністр аховы здароўя Беларусі Уладзімір КАРАНІК.**

— Мы працуем на прадухіленне і прафілактыку. Першае — гэта прафілактыка завозаў каранавіруса ў краіну. Другое — прафілактыка яго шырокага распаўсюджвання. Ва ўмовах сённяшняй глабалізацыі мы не можам гарантаваць, што вірус не пранікне на нашу тэрыторыю. Наша задача — лакалізаваць і не дапусціць яго распаўсюджвання ў краіне. Вірусам заразіцца не так проста, і, мяркую, тыя мерапрыемствы, якія цяпер праводзяцца, дазволяць пазбегнуць яго пашырэння, — адзначыў Уладзімір Каранік.

Міністр нагадаў, што кантроль наладжаны ў аэрапорце і на аўтамабільным транспарце. Пільна правяраюцца пасажыры, якія прыбываюць прамымі авіяцыйнымі рэйсамі з Кітая. Нават людзей без прыкмет рэспіраторнай інфекцыі абследуюць у лабараторных умовах — у іх бяруць мазкі са слізістай. Тых, хто прыязджае аўтамабільным транспартам, абследуюць з дапамогай цеплавізараў. Апроч гэтага, цяпер медыцынскія работнікі адпрацоўваюць розныя сітуацыі, якія могуць узнікнуць пры завозе віруса.

— Праводзяцца трэніроўкі медперсаналу з адпрацоўкай дзеянняў у выпадку выяўлення пацыентаў з падазрэннем на каранавірус. Калі чалавек, які быў у КНР, звяртаецца ў прыёмны пакой ці выклікае «хуткую», павінен быць праведзены ўвесь комплекс мерапрыемстваў па дастаўцы ў спецыялізаваную медустанову, ізаляцыі, забору біяматэрыялу, наступнай санапрацоўцы транспарту і месцаў, куды ён звяртаўся, а таксама спецадзення медперсаналу. Прашу аднесціся спакойна да такіх трэніровак: гэта планавая работа, — падкрэсліў Уладзімір Каранік.

На момант успышкі каранавіруса ў кітайскай правінцыі Ухань знаходзілася 12 беларускіх грамадзян. З васьмю з іх удалося ўстанавіць кантакт, пяцёра выказалі намер эвакуіравацца на радзіму.

— Мы звязаліся з адпаведнымі службамі Расіі і Казахстана. Абодва бакі пацвердзілі гатоўнасць забяспечыць падчас эвакуацыі сваіх грамадзян месцы на самалёце і для беларусаў. Першым прыляцеў борт Казахстана. На ім прыбылі і пяцёра нашых грамадзян. Усе яны былі змешчаны на каранцін у шпіталі Нур-Султана. На сёння ніхто з іх не мае прыкмет хваробы, іх стан не выклікае асцярог, праводзіцца лабараторны кантроль і ўсе неабходныя абследаванні. Па завяршэнні каранціну будзе прынята рашэнне аб адпраўцы іх у Беларусь. Расія плануе эвакуіраваць сваіх грамадзян у найбліжэйшыя дні. Калі беларусы, якія плануюць пакінуць Ухань ці іншыя рэгіёны, дзе праводзіцца эвакуацыя, пажадаюць выехаць, ім будзе дадзена месца на расійскім борце, — заявіў міністр.



Па звестках, на раніцу 2 лютага, 361 чалавек загінуў з-за выкліканай каранавірусам пнеўманіі ў Кітаі, 475 пацыентаў удалося вылечыць і выпісаць з бальніцы. Колькасць тых, хто захварэў, перавышае 17 тысяч. На выхадных стала вядома пра першую ахвяру віруса за межамі Кітая — на Філіпінах памёр 44-гадовы пацыент.

**Алена КРАВЕЦ.**

Праекты і рашэнні

# Мабільнік замест кашалька і «Маршруты памяці»

## Галоўны аўтаперавозчык Гомельскай вобласці рыхтуе новыя сацыяльныя і выхаваўчыя праекты

Прадпрыемства «Гомельаблаўтатранс» выраашыла апрабаваць на гарадскіх маршрутах інавацыйную сістэму аплаты праезду праз мабільны тэлефон. Тэсціраваць пілотны праект пачнуць з 6 лютага. У аснове сістэмы ляжыць QR-код на базе плацежнага сэрвісу «Аплаці». Спецыяльную мабільную праграму распрацавала мінская кампанія, а адзін з беларускіх банкаў рэалізаваў паслугу электроннага кашалька.

У аўтобусах паралельна з новай сістэмай аплаты працягнуць працаваць і кандуктары. Яны ж будуць за кантралёраў. Пакуль «тэсціць» сістэму плануецца на адным з гарадскіх маршрутаў. Увогуле стаіць задача да канца года ўкараніць новаўвядзенне ва ўсёй гомельскай гарадской транспартнай сетцы.

Дарэчы, толькі на прасоўванні праекта ў галіне інфармацыйных тэхналогій прадпрыемства ААТ «Гомельаблаўтатранс» сёлета не спыніцца. У гэтым годзе ў гонар 75-годдзя Вялікай Перамогі ў рэгіёне распрацуюць патрыятычныя аўтобусныя маршруты.

Такую задачу перад прадпрыемствам паставіў старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей падчас сустрэчы з працоўным калектывам філіяла «Аўтобусны парк № 1» ААТ «Гомельаблаўтатранс».

«Гомельская вобласць славіцца гістарычнымі месцамі. На карце рэгіёна ёсць мемарыяльныя комплексы, месцы баявой славы. У год 75-годдзя Вялікай Перамогі неабходна прапрацаваць патрыятычныя маршруты, якія раскажуць маладому пакаленню пра подзвігі дзядоў і прадзедаў», — адзначыў губернатар.

Патрыятычныя маршруты не абмінуць аграгарадок Красны Бераг у Жлобінскім раёне, дзе ўвекавечана памяць пра малалетніх вязняў фашысцкага донарскага канцлагера, мемарыяльны комплекс «Баграціён» на Светлагоршчыне і былую вёску Ола, дзе карнікі спалілі 1758 чалавек, а таксама мясціны баявой славы Лоеўскага раёна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Надвор'е

# На тое ён і люты

## У суботу пры праясненнях маразы будуць дасягаць мінус 15 градусаў

**Мы ўжо неяк прывыклі, што ў гэты зімовы сезон у нас «холад» не азначае «куслівыя маразы». А вось і не адгадалі, на двары не сакавік з красавіком, а ўсяго толькі пачатак лютага. На гэтым тыдні ў нас сапраўды пахаладае, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

Студзень у нас быў небывала цёплы, ды і ў першыя лютаўскія дні панавала анамальна мяккае паветра з міжземнамор'я. На многіх метэастанцыях краіны былі ўсталяваны новыя рэкорды гэтых дзён. Сярэднясутачныя тэмпературы за 2 лютага склалі 3—8 градусаў цяпла, што на 6—11 градусаў вышэй за кліматычную норму. Такі тэмпературны фон хутчэй адпавядае сярэдзіне красавіка.

Але нарэшце да нас ідзе зіма. У аўторак у краіну стала паступаць больш халодная паветраная маса з Балтыйскага мора. Удзень пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны прагназуецца мокры снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Заўтра ўдзень умовы надвор'я ў краіне будзе вызначаць у асноўным вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халодным паветры. Будзе воблачна з праясненнямі. У многіх рэгіёнах абыдзецца без ападкаў, толькі ўначы ў асобных раёнах па поўдні, а ўдзень месцамі па Віцебскай вобласці пройдзе невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы прагназуецца ад мінус 3 да мінус 10 градусаў, удзень — ад 6 марозу да 1 цяпла.

Сапраўдны мароз, і абавязкова са снегам, прыйдзе да нас ужо ў чацвер. У гэты дзень раніцай і ўдзень умовы надвор'я пачне фарміраваць франтальны падзел з Балтыйскага мора. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег, ляжа снежнае покрыва. Толькі ў заходніх раёнах будуць адзначацца змешаныя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, магчымы слабы галалёд. На асобных участках дарог краіны захаваецца галалёдзіца. Вецер заходні з пераходам на паўночны ўмераны. Уначы будзе 2—9 марозу, па ўсходзе пры праясненнях тэмпература апусціцца да мінус 12 градусаў. Удзень будзе ад мінус 3 градусаў па паўночным усходзе да 3 цяпла — па захадзе краіны.

Умераная класічная зіма разгуляецца ў пятніцу. У гэты дзень, 7 лютага, месцамі, у асноўным па ўсходзе Беларусі, чакаецца кароткачасовы снег, слабая мяцеліца. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночны, парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 марозу, па поўначы пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Удзень будзе ад нуля да мінус 6 градусаў. Зімовы характар надвор'я захаваецца і ў суботу. 8 лютага ўначы будзе пераважна без ападкаў, а ўдзень месцамі па краіне кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні, заходні ўмераны. Уначы будзе ад мінус 3 да мінус 10 градусаў, пры праясненнях — да 11—15 градусаў ніжэй за нуль, удзень чакаецца ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Лондане зноў адбыўся напад на глебе ісламізму



Да такой высновы прыйшла лонданская паліцыя, вывучыўшы ўсе абставіны інцыдэнту ў Стрэтэме, раёне на поўдні брытанскай сталіцы. Злачынец паспеў параніць двух чалавек: 40-гадовага мужчыну і 50-гадовую жанчыну і быў застрэлены паліцыяй. Пазней стала вядома, што за 20-гадовым Судзешам Аманам, асуджаным у 2018 годзе за тэрарызм, сачылі. Назіральнікі адзначаюць падабенства гэтага нападу ў Стрэтэме і таго, што быў здзейснены 29 лістапада мінулага года на Лонданскім мосце. Зноў дзейнічаў адзіночка, які адседзеў няпоўны тэрмін за тэрарыстычную дзейнасць, зноў яго ўзбраеннем былі нож і муляж выбуховай прылады. Праўда, гэтым разам абышлося без ахвяр: усе трое пацярпелых (яшчэ адна жанчына была параненая аскепкамі разбітага кулямі шкла) адчуваюць сябе добра і знаходзяцца пад наглядам урачоў. У брытанскім урадзе заявілі аб пераглядзе мер, якія прымяняюцца да асуджаных за тэрарызм.

### Францыя павялічвае кантынгент у Сахелі

Колькасць французскіх вайскоўцаў у афрыканскім рэгіёне Сахель будзе павялічана на 600 чалавек — з 4,5 тысячы да 5,1 тысячы. Такое рашэнне прыняў прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон. Аб гэтым паведаміла міністр абароны краіны Фларанс Парлі, перадае РІА «Навіны». Адзначаецца, што такое рашэнне было прынята пасля сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — членаў Сахельскай групы пяці (Нігер, Малі, Буркіна-Фасо, Маўрытанія, Чад) і Макрона ў французскім горадзе По ў студзені. Большая частка падмацавання будзе разгорнута ў так званай зоне трох граніц паміж Малі, Буркіна-Фасо і Нігерам. Іншая частка гэтых сіл будзе задзейнічана непасрэдна ў Сахельскай групе пяці, каб суправаджаць іх у баі, адзначаецца ў камюніке кіраўніка мінабароны Францыі.

### Сурок Філ прадвясціў раннюю вясну



Вясна сёлета надыдзе рана. Гэта прадказанне амерыканскага «народнага метэаролага», сурка Філа з мястэчка Панксатоні, штат Пенсільванія. У прысутнасці тысяч турыстаў і мясцовых жыхароў прадстаўнікі «Клуба сурка» вынялі пяцікілаграмовага грызуна з нары і сталі назіраць за яго паводзінамі. Згодна з павер'ем, калі жывёла палохаецца свайго ценю і хаваецца, зіма будзе доўжыцца яшчэ шэсць тыдняў. Калі ж Філ не бачыць свайго ценю (як адбылося сёлета), то чакай раннюю вясну. Такая традыцыя прыйшла ў Паўночную Амерыку з мігрантамі з Германіі. Там ролю прадказальніка надвор'я выконваў барсук. У Пенсільваніі барсукоў няма, таму перасяленцы ўсклалі гэтую задачу на сурка.

# АНКАЛОГІЯ — НЕ ПРЫГАВОР,

## але чым раней выяўлена пухліна, тым лепш вынікі лячэння

**Летась амаль 50 тысячам беларусаў упершыню быў пастаўлены анкалагічны дыягназ. Штогод колькасць новых выпадкаў раку павялічваецца на тысячу. Мужчыны найчасцей хварэюць на рак прастаты, жанчыны — на рак малочнай залозы. Пры тым, што захваральнасць расце, смяротнасць ад гэтага захворвання крыху зніжаецца. Сёння адзначаецца Сусветны дзень барацьбы з ракавымі захворваннямі.**

— Калі ўзяць апошнія 10 гадоў, то захваральнасць вырасла на 15 %, смяротнасць знізілася на 1,8%. У 2010 годзе смяротнасць складала 187 чалавек на 100 тысяч насельніцтва, летась — 184 чалавекі на 100 тысяч, — паведаміў **намеснік дырэктара па хірургіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Віктар КАХНЮК.**



### Якія анказахворванні найчасцей сустракаюцца ў беларусаў?

Сярод мужчын самым распаўсюджаным з'яўляецца рак прастаты. На другім месцы рак лёгкага, на трэцім — каларэктальны (рак тоўстай кішкі). У жанчын лідзіруе рак малочнай залозы, на другім месцы — каларэктальны, на трэцім — рак маткі.

— Такая структура захваральнасці ў нас захоўваецца на працягу апошніх чатырох-пяці гадоў, — адзначыў Віктар Кахнюк.

### Наколькі своечасова ставіцца дыягназ?

У 2019-м ранняя выяўляльнасць раку — на 1-2 стадыі — склала 67 %. І гэта лепш, чым год таму. А як вядома, у лячэнні анкахвароб тэрмін адыгрывае ключавую ролю: чым раней выяўлена злаякасная пухліна, тым лепш вынікі лячэння і тым большы працэнт пацыентаў вылечваецца.

### Як палепшыць выяўляльнасць?

— Гэта можна зрабіць шляхам укаранення скрынінгу на дзяржаўным узроўні. Чалавек добра сябе адчувае, ходзіць на працу, яго нічога не турбуе, але ў яго ўжо ёсць захворванне. Важна яго запрасіць на абследаванне. У нашай краіне ўжо ёсць скрынінг раку малочнай залозы, каларэктальнага, раку прастаты. Укараненне скрынінгу дазволіць павысіць выяўляльнасць рака на ранняй стадыі, — кажа Віктар Кахнюк.

Эксперт тлумачыць, што пры некаторых, як правіла, унутраных лакалізацыях пухлін абследаванне не заўсёды простае. А ёсць візуальныя лакалізацыі, якія даволі проста выявіць. Для гэтага пацыенту дастаткова прыйсці да ўрача. Напрыклад, у выпадку з ракам малочнай залозы, паставіць дыягназ не складана.

— У нас рак поласці рота выяўляецца ў 40 % выпадкаў на апошняй, 4-й стадыі. А гэта, між іншым, візуальная лакалізацыя.

Летась у межах праграмы скрынінгу раку малочнай залозы абследавана 75 тысяч жанчын (скрынінг робяць у 50-70 гадовай узроставай групе, лічыцца, што пік гэтага захворвання — 49 гадоў). Рак выяўлены ў 379 з іх, у тым ліку ў 344 — на ранняй стадыі. На рак прастаты абследавана 138 тысяч мужчын. Захворванне знайшлі ў 884 (у 80,7 % — на 1-2 стадыі). На каларэктальны рак праверылі 30 тысяч чалавек, анкалагічны дыягназ пастаўлены ў 81 выпадку (82 % на ранняй стадыі).

### Якія вынікі лячэння?

На дыспансерным уліку ў Беларусі летась знаходзілася 318 тысяч чалавек, якія маюць анкалагічныя дыягназы. З іх 160 тысяч (а гэта 51 %) знаходзяцца на ім пяць і больш гадоў.

— Еўрапейскі паказчык пяцігадовай выжывальнасці пры раку складае ад 50 да 60 %. І мы ў яго ўпісваемся. Мы добра лечым — на еўрапейскім узроўні. А каб мець яшчэ лепшыя вынікі, трэба раней дыягнаставаць хваробу.

### Ад чаго найчасцей паміраюць?

Нягледзячы на тое, што ў мужчын дамінуе рак прастаты, ад яго паміраюць нячаста, бо гэта захворванне добра паддаецца лячэнню. Асноўная прычына анкалагічнай смяротнасці ў мужчын — рак лёгкага. На другім месцы — каларэктальны рак, на трэцім — рак страўніка. Жанчыны найчасцей паміраюць ад рака малочнай залозы, каларэктальнага раку і раку страўніка.

### Як лечаць?

Асноўны шлях лячэння раку — хірургічны. Штодзень у Беларусі анколагі робяць у сярэднім 343 аперацыі, у тым ліку каля сотні — у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Будучыня гэтага напрамку — у павелічэнні колькасці камбінаваных аперацый, пашырэнні паказанняў да органазахоўных умяшанняў, развіцці эндаскапічных метадаў. Яшчэ два спосабы лячэння — прамянёвая і хімія-тэрапія. Апошняя таксама імкліва мяняецца. У прыватнасці, лячэнне індывідуальна падбіраецца кожнаму пацыенту на аснове малекулярна-генетычнага профілю пухліны.

— Узяць дваіх хворых з аднолькавай лакалізацыяй. У аднаго на фоне хіміятэрапіі поўны рэгрэс, а ў іншага наадварот — прагрэс. Такім чынам, паўстала пытанне аб малекулярна-генетычным даследаванні пухлін. Сёння ў нас ніхто не прызначае лячэнне без такога даследавання, — падкрэсліваe Віктар Кахнюк.

**Алена КРАВЕЦ.**

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім у сувязі са смерцю Міхайлічэнкі Алены Віктараўны, супрацоўніцы рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю сваёй супрацоўніцы Міхайлічэнкі Алены Віктараўны і выказвае шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.**

Грошы

# Наколькі падаражэюць долар і еўра пасля эпідэміі каранавіруса

**Якія фактары ўплываюць на курс расійскага рубля і як эпідэмія і змены на знешніх рынках адбіваюцца на нацыянальнай валюце?**



У сваіх каментарыях аналітык валютнага рынку Вадзім Іосуб прасочвае змены курсаў валют і беларускага рубля ў сувязі з наступствамі ўспышкі эпідэміі каранавіруса ў Кітаі. Прычым, ведома, гэты ўплыў на нашу валюту быў даволі апасродкаваны, лічыць ён. Адно з наступстваў эпідэміі — зніжэнне кошту сыравіны, у тым ліку прыкметнае падзенне цаны на нафту. А яно, у сваю чаргу, прыводзіць да прыкметнага падзення расійскага рубля. Менавіта таму долар да расійскага рубля падаражэў за мінулы тыдзень з 61,8 да 63,1, або на 2,1 %. Еўра падаражэла з 68,3 да 69,6 расійскага рубля, або на 1,9 %. Суадносіны еўра і долара змяніліся нязначна: еўра знізілася да долара з 1,1050 да 1,1020, або на 0,2 %.

Моцнае падзенне расійскага рубля да замежных валют у аўтаматычным рэжыме, як гэта звычайна бывае, прывяло да таго, што ў нас долар і еўра да беларускага рубля падаражэлі, а расійскі рубель патаннеў.

Долар за мінулы тыдзень падаражэў на 1,18 %, еўра вырасла на 0,99 %, а расійскі рубель упаў на 0,94 %. На распачатым тыдні тэндэнцыя па падзенні цэн на нафту і ўслед за гэтым зніжэнне расійскага рубля могуць працягнуцца. У выніку долар можа падаражэць да 2,16 беларускага рубля, еўра можа вырасці да 2,38 беларускага рубля. А расійскі рубель можа патаннець да 3,35 беларускага рубля за 100 расійскіх, лічыць эксперт.

**Што ж мы маем цяпер? Перад выхаднымі долар быў у нас у раёне 2,138, а таргі на біржы ў гэты панядзелак пачыналіся ўжо з 2,15 рубля за долар. Амаль адразу, у гэты ж дзень, пачатковы курс «зялёнага» атрымалася панізіць да мінімальнага 2,146 рубля, аднак бліжэй да канца таргоў ён усё ж выйшаў за акрэсленыя рамкі і быў нават 2,1515. Сярэднеўзважаны курс усталяваўся ў раёне 2,1483 рубля за адзін долар.**

Расійскія аналітыкі на гэта маюць уласнае меркаванне. «Эканаметрычныя мадэлі дазваляюць зрабіць высновы аб якасных і колькасных сувязях паміж абменнымі курсамі валюты — гэта азначае, што, напрыклад, рубель падае ў адносінах да долара, калі навіннае інфармацыйнае поле ўтрымлівае неспрыяльныя весткі аб падзеях у палітычным і эканамічным жыцці краіны, што і адбываецца цяпер». Расія мяжуе з Кітаем на ўсходзе, граніца не закрытая, таму навіна носіць негатыўную афарбоўку: пазіцыя рубля на валютным рынку будзе слабець. Гэта датычыцца і юаня.

Старшы аналітык Лізавета Навумава адзначае, што зніжэнне рубля адносна долара «адназначна звязана з нявызначанасцю і страхамі, якія ўразілі рынкі на фоне распаўсюджвання з Кітая невядомага каранавіруса». Іншыя эксперты дадаюць, што паміж РФ і КНР памяншаюцца абароты: сыравінныя, турыстычныя і гандлёвыя, што таксама прыводзіць да падзення курсаў рубля і юаня на валютным рынку.

І яшчэ адно. Сітуацыя з вірусам уплывае на памяншэнне аб'ёмаў вытворчасці ВУП Кітая, а таксама на зніжэнне аб'ёмаў спажывання вуглевадародаў у самім Кітаі і краінах-экспарцёрах. Гэта значыць, цэны на нафту знізяцца.

У Расіі як краіне — экспарцёры энергарэсурсаў будзе назірацца зніжэнне аб'ёмаў нацыянальнай вытворчасці, што азначае зніжэнне попыту на рубель як сродак грашовага абарачэння. У выніку чаканняў і падзення кошту нафты курс рубля зніжаецца ў дачыненні да еўра і долара, да якіх да гэтага рубель дастаткова доўга ўмацоўваўся.

**З'явілася першая апакаліптычная ацэнка** ўплыву каранавіруса на сусветную эканоміку, лічаць аналітыкі з Украіны. На іх думку, яго наступствы могуць быць параўнальныя з іпатэчным крызісам 2008—2009 гадоў (тады Украіна за год страціла амаль 15 % ВУП). Самае дрэннае ў гэтым прагнозе тое, што яго зрабілі ў рэйтынгавым агенцтве Moody's — гэта даволі кансерватыўныя хлопцы, якія рэдка панікуюць. У аснове іх прагнозу ляжыць разлічаны імі ж індэкс цэн на прамысловыя металы, ён упаў да трохгадовага мінімуму. Апошнія 30 гадоў рост глабальнай эканомікі карэляваў з цэнамі на метал. Калі сувязь захаваецца і ў 2020-м, то добрага чакаць не варта. Вядома, можна спадзявацца, што глабальная эканоміка ўжо не так залежыць ад прамысловых тавараў, як у 2008—2009 гадах, але для краін з сыравіннай эканомікай узровень прыбытку па-ранейшаму моцна залежыць ад цэн на метал. Застаецца верыць у прагноз кітайскіх эпідэміёлагаў, што эпідэмія дасягне піку ў сярэдзіне лютага, а пасля пойдзе на спад. І свет не паспее зусім спалохацца...

**Сяргей КУРКАЧ.**

Крокі да экалогіі

# ЭНЕРГІЯ З АДХОДАЎ

## Сучасная біягазавая электрастанцыя з'явілася ў ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна

**Станцыя магутнасцю 1 МВт узведзена недалёка ад буйнога свінакомплексу. Мяркуецца, што яна будзе не толькі генерыраваць «зялёную» энергію, але і нейтралізуе пах ад свінафермы, пры гэтым перятворыць арганічныя адходы ў вадкія ўгнаенні без паху.**

Інвестыцыйны праект коштам каля шасці мільёнаў долараў рэалізавала літоўская кампанія Modus Energy. Прадстаўнік кампаніі Паўлюс Бабраускас расказаў падчас адкрыцця, што гэта ўжо сёмы праект, ажыццёўлены ў Беларусі. Ён мае несумненную экалагічную накіраванасць, бо ў якасці паліва выступае біялагічная сыравіна, якая перапрацоўваецца на выхадзе ў цеплавую і электрычную энергію.

Будаўніцтва станцыі пачалося летась у маі, а ў снежні прайшлі пусканаладачныя работы. І вось устаноўка запрацавала на поўную магутнасць. Такім чынам, гноевыя сцёкі, вялікая праблема прадпрыемства ў мінулым, перапрацоўваюцца цяпер на біягумус. Угнаенне будзе ўносіцца пад пасевы, а энергія — выкарыстоўвацца на вытворчасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Экзамен для пісьменнікаў...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Шмат падзей будуць насіць сацыяльны, грамадска-палітычны характар, што важна для нашай краіны: гэта названы юбілей і Год малой радзімы. Вельмі шмат кніг, выдадзеных у канцы мінулага — пачатку гэтага года, прысвечаны гісторыі, развіццю асветы ў Беларусі. У прыватнасці, выданні «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі» пра драматычныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, кнігі-альбомы, даведачная літаратура, што расказвае аб прадстаўніках розных нацыянальнасцяў, якія вызвалялі Беларусь або ваявалі на нашай тэрыторыі падчас нямецка-фашысцкай акупацыі.

Міністр інфармацыі расказаў, што многія беларускія аўтары прадставяць на кніжнай выстаўцы свае краязнаўчыя даследаванні, што ў Год малой радзімы вельмі актуальна. Сярод іх — Юрый Кур'яновіч з кнігай пра старажытны Тураў, Іван Каліноўскі пра Прыдзвінне, Алесь Марціновіч пра Случчыну і Слуцк, Ігар Пракаповіч — пра Паставы і Пастаўшчыну. Міністр упэўнены, што гэтыя кнігі выклікаюць цікавасць ва ўсіх, хто вывучае гісторыю, асветніцтва і займаецца краязнаўствам».

— Трэба сказаць і пра стэнд Саюзнай дзяржавы, — дадаў Аляксандр Карлюкевіч. — Пад эгідай Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы будуць прадстаўлены ўсе выданні, якія выпусцяць у абедзвюх краінах. Гэта кнігі нашых беларускіх выдавецтваў, уключаючы Беларускае тэлеграфнае агенцтва, кнігі «Беларускай энцыклапедыі імя Петруся Броўкі» і «Мастацкай літаратуры». З боку Расіі — выдавецтвы «Вече», «Время», «Лаборатория знаний» і іншыя. Выданні адлюстроўваюць нашы агульныя гісторыка-культурныя тэмы, яны прысвечаны турыстычнаму патэнцыялу абедзвюх краін, асобны блок будзе датычыцца 75-годдзя Вялікай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Неад'емнай часткай стане праект «Вайна і мір», у рамках якога адбудзецца прэзентацыя праекта «Крыніцы памяці» выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Дарэчы, у гэтым зборніку дакументальных нарысаў Аляксандра Карлюкевіча і Уладзіміра Ліхадзедава ідзе аповед пра месцы Беларусі, якія звязаны з лёсамі паэтаў, празаікаў, публіцыстаў, ваенных карэспандэнтаў з Расіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. А ілюстрацыямі служаць старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава і сучасныя фатаграфіі.

**Намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ** адзначыў, што XXVII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш — самая вялікая па колькасці наведвальнікаў, запрошаных краін і мерапрыемстваў у Беларусі, таксама яна займае другое месца сярод краін СНД, уступаючы толькі Маскоўскай кніжнай выстаўцы.

— Яна дапамагае не толькі развівацца ўсёй кніжнай сферы, але і рэалізоўваць велізарную колькасць сацыяльных праектаў. У першы дзень адкрыцця плануецца мноства сустрэч і прэзентацый. Дэвіз сёлетняй выстаўкі — «Беларусь — адкрытая кніга»... Народа з адкрытым сэрцам. Народа, які чакае новых гістарычных старонак, у тым ліку аналізу нашага мінулага і будучыні. Пунктам прыцягнення ўвагі гасцей безумоўна стане прыгожае афармленне павільёна. Варта адзначыць, што вельмі важна, каб да нас далучалася як мага больш грамадскіх аб'яднанняў. Напрыклад, «Сваё асяроддзе» — група паэтаў-бардаў прэзентуе свае кнігі ў першы дзень выстаўкі.

Генеральны дырэктар Генеральнай дырэкцыі міжнародных выставак і кірмашоў, дырэктар Маскоўскага міжнароднага кніжнага кірмашу і Кніжнага фестывалю «Красная плошчадь», **прадстаўнік Ганаровага госця выстаўкі Расійскай Федэрацыі Андрэй ГЕЛЬМІЗА** паведаміў, што больш за 80 выдаўцоў Расіі прадставяць свае кнігі на Мінскай выстаўцы-кірмашы і больш за 60 мерапрыемстваў пройдзе на цэнтральным стэндзе і на іншых пляцоўках сталіцы.

— Прэзентуем вялікую калекцыю кніг, звязаную з 75-годдзем Вялікай Перамогі. Спецыяльны праект — «Прэзідэнцкая гістарычная бібліятэка. Серыя «Перамога» — рэалізаваны Расійскім гістарычным таварыствам і Выдавецкай групай «Эксма-АСТ». Туды ўвайшлі кнігі, якія пабачылі свет у час Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя класічнай кніжнай праграмы, мы сочым за тэндэнцыямі сучаснай моладзі і іх чытацкіх запатрабаванняў. Расце патрэба ў аўдыёкніжках, таму на выстаўцы-кірмашы будуць прадстаўлены выданні і ў такім фармаце.

**Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** адзначыў, што Мінская кніжная выстаўка-кірмаш — гэта своеасаблівы экзамен для пісьменнікаў. Кожная вобласць прадставіць асобныя выданні, ад іх чакаюцца прэзентацыі новых міжнародных праектаў, шматлікія аўтограф-сесіі, круглыя сталы па розных тэмах.

Летась на Міжнародную мінскую кніжную выстаўку-кірмаш прыйшла 61 тысяча наведвальнікаў. Пра гэта расказаў **старшыня Савета арганізатараў кніжных выставак і кірмашоў, генеральны дырэктар ПК ТАА «Макбел» Дзмітрый МАКАРАЎ.** «Сёлета чакаецца не менш, бо для гэтага ёсць усе перадумовы. Сёлетняя выстаўка будзе адрознівацца ад усіх дызайнам, інтэр'ерам, у тым ліку і нацыянальны стэнд. Сярод гасцей — 31 краіна. Уваход на выстаўку-кірмаш традыцыйна бясплатны», — адзначыў ён.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ЧЫТАЕМ, СЛУХАЕМ, НАТХНЯЕМСЯ

## На кніжнай выстаўцы шукайце лагатып «Звязды»

**У ліку больш чым 300 мерапрыемстваў, што пройдуць падчас 27-й Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, у Нацыянальным выставачным цэнтры на праспекце Пераможцаў, 14 адбудуцца таксама прэзентацыі новых кніжных праектаў і творчыя сустрэчы з аўтарамі і супрацоўнікамі Выдавецкага дома «Звязда». Такім чынам, шчыра запрашаем вас, шаноўныя кнігалюбы:**

**5 лютага**

• у 16.30 на дзіцячай пляцоўцы стартуе экавіктарына і майстар-клас «Другое жыццё адходаў» ад часопіса «Родная прырода», а ў 17.30 — прэзентацыя кнігі Яны Явіч «Уцёна ў Францыі».

**6 лютага**




• з 15 да 16 гадзін пройдзе аўтограф-сесія Ірыны Масляніцынай і Міколы Багадзяжа, аўтараў кнігі «Легендарныя героі беларускай гісторыі XI—XIX стст.», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда» ў 2020 годзе і змяшчае 37 біяграфічных нарысаў пра вядомых дзеячаў і народных герояў Беларусі з глыбокай даўніны да XIX стагоддзя.

**7 лютага**

• у 12.30—13.00 на дзіцячай пляцоўцы запрашае на сустрэчу маленькіх чытачоў і іх бацькоў аўтарка кніг-квэсту «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці» Кацярына Хадасевіч-Лісавая. А 13-й гадзіне прадставіць сваю кнігу «Ні секунды цішыні» Дзмітрый Юртаеў, а 15-й — раскажа пра «Басю і яе чароўны свет» пісьменніца Надзя Бука;

• у 15.00—15.30 на нацыянальным стэндзе выстаўкі будуць прэзентаваны зборнік паэзіі і прозы сучасных беларускіх аўтараў «Мая Радзіма» і фотапраект Вячаслава Цыдзіка «Бачу Беларусь такой».

**8 лютага**




• а 10-й гадзіне супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда» сумесна з БДПУ імя М. Танка прадставяць кнігу «Казкі для сяброў», якая, дарэчы, выйшла адразу на трох мовах: рускай, беларускай і французскай, таму яе можна чытаць і дома з бацькамі, і ў школе на ўроках французскай. Свае казкі расказалі ў зборніку Уладзімір Ліпскі, Алесь Карлюкевіч, Алесь Бадак, Алена Стэльмах, Міхась Пазнякоў і іншыя аўтары, малюнкі ж да гісторый стварылі самі беларускія школьнікі, а таксама студэнты — будучыя настаўнікі малодшых класаў;




• у 12.30 прэзентуе сваю кнігу «Гістарычныя прагулкі з Францыскам Скарынам» пісьменніца, журналістка і публіцыстка Інэса Плескачэўская, якая расказа, якія адкрыцці зрабіла, падарожнічаючы па слядах першадрукара ў Празе, Падуі, Кракаве і Вільнюсе, і якія месцы раіць абавязкова наведаць сваім паслядоўнікам;

• у 12.30 на дзіцячай пляцоўцы пройдзе прэзентацыя кнігі Ірыны Карнаухавай «Ах, які сёння дзень»; а 15-й гадзіне тут жа ўсе ахвотныя змогуць паглядзець спектакль «Дуб і крумкач» паводле твора Алены Стэльмах.

**9 лютага**

• у 11.30 адбудзецца прэзентацыя кнігі Ягора Конева «Здані гарадніцы»;

• а 12-й гадзіне на дзіцячай пляцоўцы — сустрэча з «Катом Зялёнкіным» і аўтарам гэтай кнігі Ларысай Калужанінай;

• у 13.30 увазе наведвальнікаў прадставяць альбом «Акварэльны сусвет Вячаслава Паўлаўца» і выстаўку работ мастака.

Акрамя таго, творчыя сустрэчы з нашымі аўтарамі адбудуцца ў некалькіх сталічных кнігарнях:

**5 лютага** а 13-й гадзіне ў «КнігаПолісе» ўсіх ахвотных чакае Міхаіл Дзеравянка — пісьменнік, аўтар фантастычных аповесцяў і казак, галоўны рэдактар дзіцячых часопісаў «Гуляю з мамай», «Маміна сонейка» і «Мішутка»;

**6 лютага** ў «Кнігарні пісьменніка» прэзентуе свае новыя кнігі «Непаслухмяны Чмелік», «Птушыныя арэлі», «Як Гаўка ў космас збіраўся» вядомы пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Зэкаў, многія творы якога мы ведаем са школы;

**6 лютага** а 10-й гадзіне ў доме кнігі «Светач» пройдзе творчая сустрэча з паэтам, празаікам, перакладчыкам, мастаком і акцёрам Дзмітрыем Юртаевым, вершы якога — лёгкія, гучныя, шумныя — не толькі даспадобы іх героям-дзецям, але і выклікаюць усмешку ў бацькоў, бабуль і дзядуляў.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

80 гадоў на карце

# ЦЯЖКА БЫЦЬ ПЕРШЫМ, ЯШЧЭ ЦЯЖЭЙ ЗАХАВАЦЬ ЛІДАРСТВА

**Святочныя мерапрыемствы прайшлі ў мінулую суботу на Нясвіжчыне. А нагодай для гэтага стаў юбілей — 80-годдзе з дня заснавання раёна.**

Стартавалі ўрачыстасці з закладкі ў фундамент будаўніцтва дзіцячага садка капсулы часу з сімвалічным пасланнем нашчадкам. Новае пакаленне прачытае яго ў 2040 годзе, калі Нясвіжскі раён адзначыць сваё стагоддзе, а Беларусь — 95 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Капсула змешчана ў спецыяльна створаную ў камені нішу і закрыта плітой.

Новы дзіцячы садок з'явіцца на працягу гэтага года.

Гэтую ўстанову адукацыі будуць наведваць 230 малых. Тут прадугледжаны басейн, медыцынскі блок, гімнастычная і музыкальная залы, гульнявыя пляцоўкі, тэрыторыя, дзе выхаванцы будуць вывучаць асновы бяспекі жыццядзейнасці, стаянка для аўтамабіляў персаналу і бацькоў ды шмат іншых выгод. Кошт аб'екта — 10,6 мільёна рублёў. Фінансавацца ён будзе з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў. Для зручнасці транспарту вуліцу Савецкую ад сярэдняй школы № 4 злучаць з вуліцай Маякоўскага. Гэта дазволіць разгрузіць транспартны рух.


Фота БелТА.

Пасля мерапрыемства ўрачыстасці перамясціліся ў раённы Цэнтр культуры, дзе прадэманстравалі яркае відовішчнае лазернае шоу «Вехі вялікага шляху». З гісторыяй, традыцыямі, дасягненнямі, знакамітымі людзьмі прысутных азнаёміў 20-хвілінны фільм аб паступальным развіцці раёна.

**— Сапраўды, Нясвіжскі раён трывала ўтрымлівае пазіцыі аднаго з вядучых аграрных цэнтраў Беларусі, — сказаў старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН. — Цяжка стаць першым, але яшчэ цяжэй захаваць лідарства.** На працягу 80 гадоў Нясвіж мяняўся. Ствараліся новыя вытворчасці, будавалася жыллё, закладваліся асновы эканамічнага патэнцыялу, дабрабыту людзей. Але асабліва развіццё раён атрымаў з моманту набыцця нашай краінай незалежнасці. Вы памятаеце, у якіх умовах мы апынуліся. Вы дастойна прайшлі той перыяд. Сведчаннем гэтага стала рашэнне кіраўніка дзяржавы аб правядзенні першых у гісторыі Беларусі рэспубліканскіх «Дажынак» менавіта на вашай зямлі.

Аляксандр Турчын таксама падкрэсліў, што перад вобласцю, а значыць, і Нясвіжскім раёнам, стаяць маштабныя і складаныя задачы — укараняць сучасныя тэхналогіі і выпускаць запатрабаваную прадукцыю, нарошчваць экспарт і прыцягваць інвестыцыі, развіваць прадпрымальніцтва і ствараць новыя рабочыя месцы, паляпшаць дабрабыт грамадзян. Прычым ён адзначыў, што Мінаблвыканкам заўсёды гатовы аказаць у гэтым дапамогу. І падтрымку ўжо адчулі: пачалося будаўніцтва дзіцячага сада, у планах на наступны год — сучасная паліклініка.

Павіншаваў усіх нясвіжан з юбілеем раёна і **старшыня райвыканкама Аляксандр ЛОМСКІ:**

— Дзень нараджэння раёна гэта, у першую чаргу, свята для тых, хто ствараў яго, хто прыняў эстафету і ўзяў адказнасць за яго далейшы лёс. Наперадзе вялікая работа. Наша задача не толькі захаваць традыцыі, гісторыю краю, але і прымножыць іх, стварыць новыя накірункі ў сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці раёна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37 |

**Предмет аукциона** (одним лотом)
**Месторасположение:** г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, д. 46

| Наименование (назначение) | Об. пл. | Инвентар. номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Склады** (здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ) | 1193,9 кв. м | 500/С-28335 | д. 46/2 |
| **Здание административно-бытового корпуса** (здание многофункциональное) | 137,2 кв. м | 500/С-28334 | д. 46/3 |
| **Здание многофункциональное** | 4270,2 кв. м | 500/С-28468 | д. 46 |
| Составные части и принадлежности: дворовая территория, тротуар, подпорная стенка, бордюр, ограждение, площадки для складирования, площадка подъездного пути грузового крана, эстакада, отстойник, площадка для размещения сушильного оборудования, заборы, ворота | | | |
| **Производственный цех** (здание специализир. для производства строит. материалов) | 1411,0 кв. м | 500/С-28339 | д. 46/1 |
| **Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель Ж1/К** | 357,3 кв. м | 500/С-51092 | д. 46/5 |
| **Здание котельной** (здание неустановленного назначения) | 65,1 кв. м | 500/С-51093 | д. 46/6 |
| Составные части и принадлежности: труба дымовая | | | |
| **Ливневая канализационная сеть (внешнеплощадочная)** (сооружение специализир. коммунального хозяйства) | 103,96 п. м | 500/С-1008470 | д. 46 |
| **Ливневая канализационная сеть (внутриплощадочная) с очистным сооружением** (сооружение специализир. коммунального хозяйства) | 271,39 п. м | 500/С-1008471 | д. 46 |
| **Внеплощадочная водопроводная сеть ВК-1-ВК-2 сущ., производственный корпус -ВК-1 сущ.** (сооружение специализир. коммунального хозяйства) | 158,99 п. м | 500/С-1008467 | д. 46 |
| **Внутриплощадочная водопроводная сеть** (сооружение специализир. коммунального хозяйства) | 351,44 п. м | 500/С-1008461 | д. 46 |
| **Хозяйственно-фекальная канализационная внутриплощадочная сеть** (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 321,36 п. м | 500/С-1008477 | д. 46 |
| **Тепловая сеть, сеть горячего водоснабжения** (сооружение специализир. коммунального хозяйства) | 88,3 и 87,7 п. м | 500/С-1008462 | д. 46 |

**Иное имущество,** входящее в состав лота:

| Наименование | Инвентар. номер | Наименование | Инвентар. номер |
|---|---|---|---|
| Сети 0,4 KB | 83 | Кран подвесной электрический | 41185 |
| Блоки гаражные 6,2*3,2 (3 шт.) | 7, 70317, 70318 | Аспирационные установки (2 шт.) | 238, 239, 80 |
| Кран подвесной однобалочный | 94 | Шлагбаум | 1147 |
| Краны ГП2Т подвесн. однобалочные (2 шт.) | 101, 109 | Котлы водогрейные «Минск-1М» (2 шт.) | 793, 794 |
| Кран ГП1Т подвесн. одноб. элек. | 110 | Теплосчетчик ТЭМ-104-1 ДУ 100 | 795 |
| Кран подвесной электрический | 102 | Теплообменник пластичный | 796 |
| Насосы ТР-300/2 (2 шт.) | 797, 798 | Насос ТРЕ 40-190/2 | 799 |
| Многолетние насаждения | 760 – 786, 7870, 7881 | | |

**Сведения о земельных участках:**
– пл. **2,4498** га предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 9569/10000) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производственной базы ПМК-1. Ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны водных объектов г. Минска, пл. 0,9124 га и 0,4420 га.
– пл. **0,4528** га предоставлен на праве временного долевого пользования (доля 1/2, срок действия по 31.05.2020) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений (проезд). Ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны водных объектов, охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения и канализации

**Начальная цена с НДС 20 % – 5 273 526,01 бел. руб.**

**Дополнительная информация:** в состав лота не входит оборудование трансформаторной подстанции ТП-2267 (ТМ 250/10), камеры силового оборудования РП-2267, хозфекальная канализационная внеплощадочная сеть (инв. № 500/С-1008466)

**Обременения**: площади частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 11.03.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 09.03.2020 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

# Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гродненская обувная фабрика «Неман» 10 марта 2020 года

| | |
|---|---|
| **Вид аукциона (открытый)** | Лот № 1 * |
| **Предмет аукциона** | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-142786 (контрольно-пропускной пункт), общей площадью 22,0 кв. м. Одноэтажное кирпичное здание 1960 года постройки. Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-142085 (благоустройство территории возле здания контрольно-пропускного пункта): асфальтобетонное покрытие площадью 248 кв. м, ограждение (плита железобетонная на железобетонных столбах): высота 2,3 м, длина 7,7 м, ворота откатные с электроприводом шириной 5 м |
| **Начальная цена продажи** | 26 328,0 руб. (в т. ч. НДС 20 %) |
| **Кадастровые номера земельных участков и размеры** | 440100000001011085<br>0,0614 га |
| **Месторасположение земельных участков** | г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95 |
| **Имущественное право земельных участков** | Право постоянного пользования |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество «Гродненская обувная фабрика «Неман», г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95, тел.: 8 (0152) 520400, 527200 |
| **Сумма задатка** | 2632,8 руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010 |
| **Дата проведения аукциона** | 10 марта 2020 года |
| **Время проведения аукциона** | 12.00 |
| **Место проведения аукциона** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал |
| **Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 |
| **Дата и время начала приема документов** | 10 февраля 2020 года, 8.00 |
| **Дата и время окончания приема документов** | 4 марта 2020 года, 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».
**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.
**Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 15 дней с момента заключения договора купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайтов: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

# Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) (г. Гродно, ул. Суворова, д. 76В) 10 марта 2020 года

| | |
|---|---|
| **Вид аукциона (открытый)** | Лот № 1 |
| **Предмет аукциона** | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-24959 (административно-бытовой корпус), общей площадью 971,9 кв. м с составными частями и принадлежностями: цокольный этаж; капитальное строение с инвентарным номером 400/С-38275 (здание материального склада), общей площадью 1977,7 кв. м; незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 400/U-119585 (готовность 38 %) общей площадью 3451 кв. м с составными частями и принадлежностями: цокольный этаж |
| **Начальная цена продажи** | 680 000,00 руб. (в т. ч. НДС 20 %) |
| **Кадастровые номера земельных участков и размеры** | 440100000001002907<br>0,3910 га |
| **Месторасположение земельных участков** | г. Гродно, ул. Суворова, д. 76В |
| **Имущественное право земельных участков** | Право постоянного пользования |
| **Продавец** | Закрытое акционерное общество Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, д. 14, тел.: +375295005655, +375339037951 |
| **Сумма задатка** | 34 000,00 руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010 |
| **Дата проведения аукциона** | 10 марта 2020 года |
| **Время проведения аукциона** | 12.00 |
| **Место проведения аукциона** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал |
| **Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 |
| **Дата и время начала приема документов** | 10 февраля 2020 года, 8.00 |
| **Дата и время окончания приема документов** | 4 марта 2020 года, 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Главное областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в соответствии с договором купли-продажи.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

# Извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельных участков для строительства объекта (ул. Маслакова, ул. Горновых, микрорайон «Барановичи-1») в городе Гродно 10 марта 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Маслакова | 1,7908 | 440100000001008783 | 215 194,11 | 21 519,41 | 9217,19 | Строительство объекта общественного назначения по индивидуальному проекту переменной этажности |
| 2* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Горновых, 29 | 1,1254 | 440100000001011090 | 258 618,48 | 25 861,84 | 4817,1 | Строительство объекта общественного назначения (здание высотой до 5 этажей по индивидуальному проекту) |
| 3* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Микрорайон «Барановичи-1» | 0,3427 | 440100000003003455 | 30 345,24 | 3034,52 | 3569,26 | Строительство общественного здания по индивидуальному проекту 1-2-этажное, назначение помещений и показатели определить проектом (торговое, общественное питание, бытовые услуги и др.) |

- земельный участок имеет ограничения.
Победитель аукциона обязан:
в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта;
приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;
осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.
В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.
Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:
1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить расходы по подготовке документации для проведения аукциона.
4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.
**Аукцион состоится 10 марта 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.
Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 10 февраля по 4 марта 2020 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-00-10**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

# На чым расце наш дабрабыт

## Беларускія вучоныя сабралі «дасье» на глебы краіны



**Ужо амаль 90 гадоў Інстытут глебазнаўства і аграхіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі займаецца даследаваннямі зямельных рэсурсаў і навуковым абслугоўваннем сельскай гаспадаркі. Сучасныя глебы на тэрыторыі Беларусі пачалі ўтварацца 12-15 тысяч гадоў таму, і кожны сантыметр фарміраваўся цягам 100—300 гадоў. Вось чаму мы павінны сачыць за гэтым рэсурсам, берагчы яго. Да таго ж, як запэўнілі беларускія вучоныя, ад глебы залежыць... дабрабыт краіны. Захаванне яе ўрадлівасці адносіцца да ліку найважнейшых дзяржаўных прыярытэтаў.**

### Банк даных

Цяжка атрымаць добры ўраджай без ведаў пра стан і якасную ацэнку сельгасугоддзяў. І беларускія вучоныя на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў назіраюць за якасцю зямельных рэсурсаў. Даследаванні не спыняліся ні на адзін год, нават у складаныя 90-я дзяржава фінансава падтрымлівала работы вучоных. За пасляваенны перыяд праведзена тры туры глебавых даследаванняў і пяць тураў якаснай ацэнкі глебы. Адсочваецца шэраг паказчыкаў: кіслотнасць, утрыманне фосфару, калію, магнію, кальцыю, гумусу, медзі, бору, цынку, серы, а пасля Чарнобыльскай аварыі яшчэ і стронцыю і цэзію.

Такія веды неабходны аграрыям у тым ліку і для таго, каб рацыянальна выкарыстоўваць угнаенні і атрымліваць максімальную аддачу. Адно з найважнейшых дасягненняў, якім можа пахваліцца Інстытут глебазнаўства і аграхіміі, — манаграфія «Глебы Рэспублікі Беларусь». Упершыню ў рэспубліцы на аснове сістэматызаваных даных навуковых і буйнамаштабных глебава-картаграфічных даследаванняў праведзена ацэнка трансфармацыі будовы, складу і ўласцівасцяў глеб сельскагаспадарчых зямель за больш чым 40-гадовы перыяд назіранняў. Падобных работ пакуль не было ў іншых краінах на постсавецкай прасторы.

Інстытут пастаянна праводзіць даследаванні па ацэнцы ўплыву сродкаў хімізацыі, у першую чаргу арганічных угнаенняў, на ўраджайнасць і якасць сельскагаспадарчых культур. Яшчэ ў 1980-м упершыню на тэрыторыі былога Саюза беларускімі вучонымі быў сфарміраваны банк даных аграхімічных уласцівасцяў глеб па кожным элементарным участку. Ужо некалькі дзесяцігоддзяў гэты банк працуе на карысць сельскай гаспадаркі. Сёння пры дапамозе камп'ютараў па кожным полі пад кожную культуру з улікам усіх магчымых паказчыкаў можна разлічыць план выкарыстання мінеральных угнаенняў. Такую каштоўную інфармацыю аграрыі атрымліваюць перад вясенняй сяўбой і перад сяеннем азімых культур.

На Беларусі ў структуры ворных зямель пераважаюць дзярнова-падзолістыя глебы. Яны вельмі бедныя на элементы сілкавання і маюць кіслую рэакцыю. Натуральна, каб на іх атрымаць ураджай, неабходна правесці шэраг аграхімічных мерапрыемстваў. Наша дзяржава ўкладае немалыя сродкі ў вапнаванне глебы, бо гэта адзін з найважнейшых фактараў захавання ўрадлівасці. Да таго ж калі кіслотнасць нармальная, прымяненне мінеральных угнаенняў будзе эфектыўным. І наадварот, на кіслых землях яны не стануць «працаваць».

### Меню для глебы

Глебу трэба правільна «карміць». Сёння беларускія хімічныя заводы выпускаюць тры неабходныя для сельскай гаспадаркі віды ўгнаенняў: азотныя, фосфарныя і калійныя. «Каб унесці кожнае ўгнаенне, неабходна, каб трактар прайшоў па полі, плюс некалькі разоў трэба правесці апрацоўку раслін па абароне ад пустазелля, хвароб і шкоднікаў. Глеба ўшчыльняецца, і гэта можа прывесці да зніжэння ўраджайнасці культур, якія на ёй вырошчваюцца, — зазважае **дырэктар Інстытута глебазнаўства і аграхіміі акадэмік Віталь ЛАПА**. — Таму сёння неабходны комплексныя ўгнаенні. І так прынята ва ўсім свеце — каля 70 працэнтаў ад агульнага аб'ёму ўгнаенняў выкарыстоўваецца ў выглядзе комплексных».

Інстытутам глебазнаўства і аграхіміі распрацаваны поўны асартымент такіх сілкаванняў для глебы. У гранулах утрымліваюцца ўсе неабходныя элементы: азот, фосфар, калій, медзь, цынк, сера, кальцый. Прычым пад розныя культуры падбіраецца сваё «меню». Напрыклад, суадносіны элементаў для азімых і яравых культур могуць розніцца, тое ж і з кукурузай, цукровымі бурakamі. Падабраныя пад канкрэтныя патрэбы ўгнаенні выпускаюцца на Гомельскім хімічным заводзе. Толькі за перыяд з 2006 да 2017 года было выпушчана каля паўмільёна тон такіх угнаенняў, якія нашы гаспадаркі ўнеслі на свае палі.

### Дапаможнікі для аграрыяў

Даследаванні змянення нашай зямлі-карміцелькі з'яўляюцца аднымі з найважнейшых у краіне. Вышэйзгаданая праца пра глебы Беларусі паказвае не толькі сучасны стан зямель з усімі характарыстыкамі, але і іх дынаміку і эвалюцыю. Таму яна мае важнае экалагічнае і агранамічнае значэнне. Гэта распрацоўка вучоных будзе карысная спецыялістам у галіне глебазнаўства, аграхіміі, земляробства, экалогіі, меліярацыі, землеўпарадкавання.

Калектывам аўтараў Інстытута глебазнаўства таксама быў створаны даведачны дапаможнік «Атлас глеб сельскагаспадарчых зямель Рэспублікі Беларусь». Дарэчы, падобныя выданні сёння не рэдкасць. Напрыклад, у Расійскай Федэрацыі існуюць атласы глеб асобных рэгіёнаў і Нацыянальны атлас глеб РФ, а таксама створаны Атлас глеб Еўропы.

Неабходнасць стварэння атласа абумоўлена многімі прычынамі. Ва ўмовах інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, нарастання антрапагеннай нагрузкі для вырашэння задач экалагічна бяспечнага землекарыстання, забеспячэння харчовай бяспекі краіны неабходны ўлік галоўнай якаснай характарыстыкі глебы — яе ўрадлівасці, якая фарміруецца ў выніку пастаяннай трансфармацыі ў сістэме глеба—расліна—навакольнае асяроддзе. У навуковым выданні выкладзены актуальныя сістэматызаваныя звесткі аб сучасным стане глеб па тыпах глебаўтварэння, ступені ўвільгатнення, гранулametрычным саставе. У 171 табліцы прыводзяцца характарыстыкі і ўлічваюцца сярэднестатыстычныя паказальнікі іх фізіка-хімічных, аграхімічных, воднафізічных уласцівасцяў, гранулametрычнага і мінералагічнага складу. Пададзена аграэкалагічная характарыстыка эрадзіраваных і дэфляцыйна-небяспечных глеб краіны.

### Як ацаніць зямлю?

Для паспяховага вядзення сельскай гаспадаркі неабходна мець дакладную, навукова абгрунтаваную інфармацыю пра колькасць і якасць зямель у кожнай сельскагаспадарчай арганізацыі. З гэтай мэтай у Рэспубліцы Беларусь перыядычна праводзяцца глебавыя, аграхімічныя і іншыя абследаванні з далейшай ацэнкай, якая ва ўмоўных адзінках, балах і іншых паказальніках адлюстроўвае ўрадлівасць глеб датычна да вырошчвання палявых культур.

Ацэньваць сельскагаспадарчыя землі калгасаў і саўгасаў на Беларусі пачалі яшчэ ў 60-я гады. З цягам часу ў сувязі з правядзеннем работ па павышэнні ўрадлівасці глебы, унясенні ўгнаенняў, вапнаванні, асушальнай меліярацыі якасны стан зямельных угоддзяў мяняўся. Апошні тур кадастравай ацэнкі сельскагаспадарчых зямель быў выкананы ў 2009—2016 гадах. Сярод асноўных паказальнікаў, якія характарызуюць якасць зямель, — агульны бал кадастравай ацэнкі, бал урадлівасці глеб, нарматыўны чысты прыбытак, дыферэнцыяльны прыбытак і кадастравы кошт зямлі. Гэтыя паказальнікі былі ўстаноўлены па ўсіх відах зямель, як ворных, так і лугавых. Для ворных зямель побач з агульнай прыводзілася ацэнка пад асобныя сельскагаспадарчыя культуры, якія вырошчваюцца ў краіне.

Першаснай тэрытарыяльнай адзінкай з'яўляліся рабочыя ацэначныя ўчасткі, па іх збіраліся ўсе неабходныя звесткі і праводзіліся разлікі. Далей ацэньваліся буйнейшыя тэрытарыяльныя адзінкі — палі, севазваротныя масівы, вытворчыя падраздзяленні, сельскагаспадарчыя землі ў цэлым па землеўладаннях, раёнах, абласцях і краіне.

«Шкала ацэначных балаў распрацавана ў Інстытуце глебазнаўства і аграхіміі. Па ёй ацэньваюцца тыпавыя адрозненні, характар і ступень увільгатнення, састаў глебаўтваральных і падсцілаючых парод, пабудова глебавага профілю як найбольш стабільныя характарыстыкі, якія вызначаюць узровень урадлівасці глеб пры аптымальных умовах рэалізацыі іх генетычнага патэнцыялу. Гэта так званыя выходныя балы, — тлумачыць **вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута глебазнаўства і аграхіміі, кандыдат сельскагаспадарчых навук Леанід ШЫБУТ**. — У сучаснай шкале ацэначных балаў адлюстравана бальнасць 332 глебавых разнавіднасцяў у сярэднім па ворыве і па 16 сельскагаспадарчых культурах. Для ворных зямель, зямель пад пастаяннымі культурамі, палепшаных лугавых уводзяцца папраўчыя каэфіцыенты на камяністасць, аграхімічныя ўласцівасці, меліярацыйны стан, агракліматычныя ўмовы. Такая методыка ацэнкі ўрадлівасці глеб дазваляе таксама вызначыць рэзервы для павышэння ўрадлівасці і давядзення да аптымальных параметраў».

Балы ўрадлівасці глеб могуць выкарыстоўвацца пры вырашэнні разнастайных задач у галіне сельскагаспадарчай вытворчасці. Інфармацыя перададзена ўсім сельскагаспадарчым арганізацыям, па якіх праводзілася ацэнка, раённым і абласным упраўленням сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання, размешчана на сайце Дзяржаўнага камітэта па маёмасці РБ і апублікавана ў манаграфіі «Кадастравая ацэнка сельскагаспадарчых зямель сельскагаспадарчых арганізацый і сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак».

### Самыя ўрадлівыя — Гродзеншчына і Нясвіжскі раён

Бал урадлівасці ворных зямель цяпер у сярэднім па краіне складае 32 адзінкі. Сярод абласцей максімальным балам ацэнены ворныя землі Гродзенскай вобласці (35,5), мінімум у Віцебшчыны — 28,4. Па раёнах балы ўрадлівасці глеб змяняюцца ад 43,9 у Нясвіжскім раёне Мінскай вобласці да 22,5 у Гарадоцкім — Віцебскай. Па асобных гаспадарках ваганні балаў яшчэ больш значныя — ад 50,6 бала ААТ «Тураўшчына» Жыткавіцкага раёна да 17,6 ААТ «Камарынскі» Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. Матэрыялы кадастравай ацэнкі зямель знаходзяць шырокае прымяненне ў краіне. Яны выкарыстоўваюцца для ўстанаўлення ставак зямельнага падатку на сельскагаспадарчыя землі, вызначэння памеру ўрону, які прычыніў землекарыстальнік, для аптымізацыі размяшчэння пасеваў, прагназавання і ацэнкі вынікаў гаспадарчай дзейнасці сельскагаспадарчых арганізацый, пры вырашэнні іншых задач забеспячэння рацыянальнага выкарыстання.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

• **Тым часам**

## Створана глебавая карта Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка

Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік быў створаны ў зоне адчужэння на тэрыторыі трох пацярпелых ад Чарнобыльскай аварыі раёнаў — Брагінскага, Хойніцкага і Нараўлянскага. Прыкладна 30 працэнтаў радыеактыўнага цэзію, што выпаў на тэрыторыю Беларусі, прыйшлося на гэтыя землі. Таксама запаведніку «дасталася» 70 працэнтаў стронцыю і каля 97 працэнтаў ізатопаў плутонію. Палескі запаведнік з'яўляецца найбуйнейшым у Беларусі і адыгрывае важную ролю ў захаванні біялагічнай разнастайнасці як Рэспублікі Беларусь, так і Усходняй Еўропы. Важна мець інфармацыю пра тое, што сёння ўяўляюць гэтыя тэрыторыі. І адно з даследаванняў, праведзеных беларускімі вучонымі, якраз было звязана з запаведнікам. Аб'ектам іх назіранняў стала глеба — найменш вывучаны кампанент прыродных экасістэм, які з'яўляецца пачатковым звяном у міграцыі радыенуклідаў.

Па прапанове Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, вучоныя Інстытута глебазнаўства і аграхіміі НАН Беларусі правялі даследаванні, на аснове якіх склалі глебавую карту тэрыторыі і адпаведны дапаможнік. Атрыманыя звесткі будуць карысныя для мадэлявання ці прагназавання міграцыі радыенуклідаў па харчовых ланцужках і для прыняцця рашэнняў пры распрацоўцы праграм і праектаў па ўтрыманні і кіраванні зонай адчужэння, выкарыстанню эксперыментальна-гаспадарчай зоны запаведніка.

Ігуменскі тракт
№ 2 (245)



Слухай сваё

# ПЕСНІ З ВОДАРАМ КАЛІНЫ

**Папулярызатар беларускага фальклору, музычны гурт Vuraj прадставіў прыхільнікам новы рэліз пад назвай Kalyna («Калына»), у які ўвайшлі песні, знойдзеныя падчас экспедыцыі па Брэсцкай вобласці вясной 2019-га.**




На дыску чатыры запісы, але толькі дзве песні. Рэч у тым, што кампазіцыі запісаныя ў двух варыянтах: «вурайскім», асучасненым у гуказапісваючай студыі, і традыцыйным, ад саміх носьбітаў палескіх спеваў. «Гэтым разам мы паставілі перад сабой задачу максімальна захаваць аўтэнтыку твораў — мелодыі, вымаўленне, настрой і нават саму манеру выканання», — гаворыць пра сваю новую работу **лідар гурта Сяржук ДОЎГУШАЎ.** З гэтай мэтай на запіс адной з песень запрасілі вакалістку полацкага гурта «Варган» Ганну Лутаву, а ў другой кампазіцыі гучаць галасы спявачак з народнага калектыву «Бабіна лета».

Каляндарную веснавую песню «Юр'я» музыканты адшукалі ў вёсцы Аранчыцы Пружанскага раёна — яе выконваў калектыў «Бабіна лета», які быў створаны яшчэ ў 80-я і па сёння працягвае традыцыю народных спеваў. (Як напаўжартоўна запэўнівае кіраўнік і найстарэйшая ўдзельніца творчай суполкі, 84-гадовая Тацццяна Пушко, спевам узрост не замінае.)

Што да загалоўнай песні «Калына», яна паходзіць таксама з Брэсцкага Палесся, а дакладней, з Драгічынскага раёна. Запісалі яе ў вёсцы Волька ў выкананні сямейнага дуэта Еўдакіі Зіновіч і Фёдара Булыгі, якія беражліва захоўваюць «колішнія» песні, а ў дадатак займаюцца ткацтвам і народнымі рамёствамі. Сюжэт песні досыць распаўсюджаны: маладая прыгажуня пераехала жыць да мужа, аднак у новай сям'і ёй даводзіцца цяжка, бо свякруха яе неўзлюбіла ды ўсяляк нагаворвае.

У хуткім часе Vuraj абяцае прадставіць відэасюжэт аб тым, як праходзіла экспедыцыя і запіс песень. А паслухаць іх можна ўжо цяпер у сеціве — на Soundcloud і стрымінг-сэрвісах «Яндэкс.Музыка», YouTube Music, iTunes ды іншых.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Запрашальнік

# УСЕ ХОРЫ Ў ГОСЦІ ДА НАС

**Міжнародны фестываль праваслаўных песнапенняў «Каложскі благавест» у дзевятнаццаты раз пройдзе ў Гродне напрыканцы лютага.**

Удзельнікамі творчага форуму сёлета стануць 37 найлепшых хароў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Латвіі, Сербіі, Румыніі, Узбекістана. А вось калектывы з Фінляндыі, Нідэрландаў і Эстоніі выступяць у межах фэсту ўпершыню. «У апошнія гады фестываль збірае рэкордную колькасць замежных калектываў. Наогул, «Каложскі благавест» за гады свайго існавання стаў не толькі візітоўкай Гродзеншчыны, але і адным з вядучых праваслаўных фестываляў у свеце, маштабным культурным мерапрыемствам, якое аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных краін і канфесій», — адзначаюць у абласным метадычным цэнтры народнай творчасці.

Урачыстае адкрыццё «Каложскага благавесту» адбудзецца 19 лютага ў Гродзенскім абласным драмтэатры. Старт фестывалю дасць канцэрт леташняга пераможцы конкурсу праваслаўных песнапенняў, мужчынскага хору «Усіхсвяцкі» сталічнага прыхода ў гонар Усіх Святых. Конкурсныя выступленні ўдзельнікаў гледачы змогуць ацаніць 20-21 лютага ў Свята-Пакроўскім кафедральным саборы, а ўзнагароджанне лаўрэатаў і гала-канцэрт запланаваныя зноў жа ў драмтэатры 22 лютага. Акрамя таго, у праграме форуму — прагляд і абмеркаванне фільмаў праваслаўнай тэматыкі, вечар духоўнай паэзіі і аўтарскай песні, тэматычныя выстаўкі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Таямніцы сталіцы

# ПАД ЗАСТУПНІЦТВАМ ФЕЛІЦЫЯНА,

## або Мінск хрысціянскі

**Старая тапаніміка магла б дапамагчы вывучаць гісторыю горада — у прыватнасці, сёння гаворка пойдзе пра Мінск. Часта назвы вуліц паказвалі, да якіх храмаў яны вялі. Напрыклад, Юр'еўская, Дамініканская, Бернардзінская, Казьмадзям'янаўская. Апошняя моцна пацярпела ў гады Вялікай Айчынай вайны, але яшчэ некалькі дамоў на ёй дастаялі да 70-х, і на савецкіх плакатах тады пісалі, што «пад ударамі пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва памірае стары сярэднявечны губернатарска-архіерэйскі горад Мінск»...**


Бакавы фасад касцёла Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

Так, наш горад страціў многа сваіх храмаў, сярод якіх былі і адны з самых прыгожых, як, напрыклад, Дамініканскі касцёл Святога Тамаша Аквінскага. Будынак быў моцна пашкоджаны ў вайну, але «прыбралі» яго толькі ў 1950 годзе, калі расчышчалі плошчу, каб паставіць велізарны помнік Сталіну. Калі гэты барочны храм захацелі б аднавіць, то ён стаяў бы за будынкам Палаца Рэспублікі. У 30-х гадах была ўзарвана Казанская царква. Сцены Пакроўскай царквы былі выкарыстаны пры пабудове Дома афіцэраў, але сутарэнні храма і сёння можна пабачыць унутры гэтага будынка, калі наведаць тамтэйшы бар, што працуе ў падвальных памяшканнях. Размешчаны на Камуністычнай вуліцы будынак Міністэрства абароны (ранейшы штаб Беларускай ваеннай акругі) таксама ўбудаваны ў былое жаночае духоўнае вучылішча, а Сувораўскае — «упісалася» ў будынак семінарыі.

А ці ведаеце вы, адкуль пайшла назва Юбілейнай плошчы? У 1825 годзе ў Мінску адзначалі 1500-годзе Нікейскага сабора. А праз год тут з'явіўся юбілейны знак. Каплічка, узведзеная тады ў гонар хрысціянскай падзеі, прастаяла да 50-х гадоў мінулага стагоддзя, і між іншым каля яе часта адбываліся мітынгі, дэманстрацыі.

### У пошуку старых будынкаў

Сёння пра тое, што побач з выхадам метро «Няміга» знаходзіўся старажытны цэнтр Мінска, нагадваюць толькі шыльда ды памятны знак на ўзбярэжжы Свіслачы пра былую царкву XII стагоддзя, якая так і не была дабудавана. Затое захаваліся яе падмуркі і сучасная пліткай выкладзены абрысы храму. У XII—пачатку XIII стагоддзяў у гэтым месцы хавалі заможных людзей, і археолагі, якія вялі раскопкі на Замчышчы, знайшлі тут больш за дваццаць пахаванняў, сярод якіх была жанчына з заплеценай касой, — мяркуецца, мінская князёўна.

Сярод самых старажытных храмаў горада можна назваць царкву Раства Багародзіцы, якая размяшчалася пры Замчышчы. Менавіта ў ёй спачатку захоўваўся абраз Мінскай Божай Маці. Таксама ёсць звесткі, што ў цэнтры горада дзейнічалі Святамікольская і Уваскрасенская цэрквы.

Самы ж стары храм Мінска, які дажыў да нашых дзён, — гэта царква Святых Апосталаў Пятра і Паўла — былая Вялікая Кацярынінская, пабудаваная літаральна на ахвяраванні гараджан у 1611 годзе.

На сцяне чатырохсотгадовага храма можна пабачыць шыльду з імёнамі людзей, якія давалі сродкі на будаўніцтва царквы Святых Пятра і Паўла.

— Маё перакананне, што будынкі, у якія ўкладзена вялікая любоў, на якія людзі самі збіралі і ахвяравалі грошы, вельмі цяжка знішчыць, — дзеліцца падчас экскурсіі «Мінск хрысціянскі» **гісторык і краязнаўца Павел КАРАЛЁЎ.** — Так, з усёй Нямігі засталася толькі гэта царква. Тое ж самае і з касцёлам Святых Сымона і Алены (ці не цуд, што на Савецкай вуліцы побач з Домам урада ўдалося захаваць храм)?

Пра тое, як у мінулым стагоддзі вялася барацьба з рэлігіяй, можна пачытаць як у старых газетах, так і пачуць ад відавочцаў і ўдзельнікаў тых падзей. Напрыклад, дысідэнт Пётр Грыгарэнка пісаў, што падрыўныя работы былі аднымі з самых прыбытковых, грошы за іх цяклі ракой. Грыгарэнка ўдзельнічаў у знішчэнні праваслаўных храмаў у Беларусі і прызнаваўся, што «заламваў» вялікія кошты за свае паслугі, але яго ўмовы прымалі адразу, без торгу. Пазней ён каяўся ў зробленым, з жахам узгадваў, як раней радаваўся таму, што пасля ўзрыву застаецца груды цэглы, якую можна было выкарыстоўваць для розных патрэб...



Захаваліся фатаграфіі Казанскай царквы.

Сёння горад вяртае страчанае. Так, побач з ратушай на плошчы Свабоды была аднаўлена царква Святога Духа (храм таксама быў узарваны ў 30-я гады). Адноўлены будынак у архітэктурных формах XVII — XVIII стагоддзяў. Зараз у ім знаходзіцца канцэртная зала «Верхні горад».

### Храм... пад нагамі

Калі будзеце гуляць у Мінску па старым горадзе, зможаце ўбачыць шыльды, на якіх пазначаны ранейшыя назвы вуліц, і нават прайсціся па тэрыторыі былых храмаў. На Камсамольскай вуліцы, калі яе рабілі пешаходнай, патрапілі на падмуркі былога касцёла Арханёла Міхаіла і кляштара бенедыктынцаў. Сёння пра межы і форму храма «расказвае» чырвоная плітка пад нагамі — яе выклалі па перыметры ў тым месцы, дзе яшчэ ў XIX стагоддзі размяшчалася пабудова. У свой час бенедыктынцы разгарнулі ў Мінску неблагую гаспадарчую дзейнасць (фізічная праца — абавязковы «пункцік» у гэтага ордэна). Побач быў сад, які манахі даглядалі, дзейнічала пякарня. Дарэчы, у Еўропе бенедыктынцы аднымі з першых пачалі гатаваць каву, а шампанскае «П'ер Перыньён», больш вядомае як «Дом Перыньён», — вынаходніцтва манаха гэтага ордэна... У 1832 годзе Мінскі кляштар быў скасаваны, маёмасць перададзена гарадскім уладам, паступова пабудовы былі разбураны, а на іх тэрыторыі з'явіліся жылыя дамы.

Павел Каралёў прапануе паглядзець на бакавы фасад касцёла Найсвяцейшай Дзевы Марыі — большасць жыхароў Мінска наўрад ці дасюль (Рэвалюцыйная, 1А) дабіралася. А дарма. Калі пярэдні фасад касцёла за савецкім часам быў перароблены, дык з унутранага боку двbörjade сцены храма нхто не чапаў. У 1920—1930-я гады будынак выкарыстоўвалі як аўтамайстэрню, а пасля вайны тут размясціўся спартыўны комплекс таварыства «Спартак». І толькі ў 1993 годзе храм вярнулі вернікам пасля таго, як на працягу сямі месяцаў людзі штодня хадзілі сюды і маліліся за аднаўленне святыні.

Менавіта ў касцёле Дзевы Марыі захоўваліся мошчы галоўнага святога горада — Феліцыяна (іх з Рыму прывёз мінскі ваявода Крыштаф Завіша). Дарэчы, вуліца Камсамольская да сярэдзіны XIX стагоддзя была Феліцыянаўскай. У XIX стагоддзі, 6 лютага, дзень Святога Феліцыяна-пакутніка, у Мінску адзначаўся як Дзень горада, з масавымі гуляннямі ды кірмашамі. За савецкім часам мошчы святога былі страчаны. На жаль, сёння забыліся ў горадзе пра свайго заступніка. Але што перашкаджае ўспомніць?



**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Землякі

# СОНЦА ДЛЯ РАДЗІМЫ

**...У 1951 годзе загадчык секцыі этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР Міхаіл Кацар увайшоў у групу, якая па загадзе ўрада распрацоўвала новы ўзор сцяга БССР — з нацыянальным каларытам, што адразу б адрозніваў сцяг ад іншых рэспублік. Вучоны, этнограф і мастацтвазнаўца шмат падарожнічаў па Беларусі і ў прыватнасці па роднай Віцебшчыне, вывучаў фальклор, народныя строі, паясы, рушнікі. Фрагмент узору з рушніка яго роднай сястры Матроны Маркевіч даследчык адшукаў у даваенных архівах «Белпрамсавету» і ў супрацы з мастаком Міхаілам Гусевым распрацаваў на яго аснове арнаментальную стужку для беларускага сцяга. Праект ацэньвала цэлая камісія, выбіраючы з мноства варыянтаў, — і зацвердзіла менавіта гэты, які сваім жыццесцвярджальным зместам як найлепш пасаваў ідэі будаўніцтва маладой савецкай рэспублікі. А ў 1995 годзе, калі ўжо незалежная Беларусь выбірала свой дзяржаўны сімвал, савецкую сімволіку са сцяга прыбралі, а вось адметную чырвона-белую арнаментальную паласу пакінулі.**

Праўда, доўгі час аўтарства сенненскай сялянкі замоўчвалася. Рэч у тым, што яе муж Аляксей Маркевіч трапіў у махавік рэпрэсій 1930-х і быў расстраляны як «кулацкі элемент» і «вораг народа». Рэабілітавалі яго ажно ў 1986-м. Сама ж Матрона Сяргееўна, адна з васьмі дзяцей заможнага селяніна, не падтрымлівала зносін з братам-вучоным, каб не нашкодзіць яго кар'еры, працягвала жыць і ставіць на ногі дзяцей. У Вялікую Айчынную яна страціла сына Міхаіла і дах над галавой (вёска Касцялішча, дзе ўдава жыла з дзецьмі, была спаленая), аднак жанчына не толькі мужна стрывала ўсе ўдары лёсу, але і падтрымлівала, як магла, аднавяскоўцаў у барацьбе з ворагам: пякла і насіла ў лес хлеб партызанам, потым удзельнічала ў аднаўленні калгаса... Памерла яна на 71-м годзе жыцця, і да апошняга займалася рукадзеллем.

Толькі напрыканцы мінулага стагоддзя энтузіясты-краязнаўцы выйшлі на сувязь са сваякамі, адшукалі магілу Матроны Маркевіч і ўвогуле зрабілі вельмі многае, каб ушанаваць гэта імя не толькі на малой радзіме.

Цяпер у Сенненскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі, які займае большую частку былой земскай управы (будынак яе быў узведзены ў 1910 годзе, а таму і сам з'яўляецца гістарычнай каштоўнасцю), адзін з раздзелаў экспазіцыі якраз расказвае пра таленавітую ўраджэнку Сенненшчыны, яе няпросты жыццёвы шлях, працу, сям'ю і нашчадкаў.





Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**Галоўная захавальніца фондаў Сенненскага гісторыка-краязнаўчага музея Браніслава ЖАЛТАБРУХАВА** расказвае:

— У музейных фондах захоўваецца чатыры тысячы адзінак экспанатаў. Матроне Маркевіч прысвечана асобная частка сталай экспазіцыі. Вось, напрыклад, яе рушнік — на жаль, не той самы, з якога яе брат Міхаіл Кацар узяў фрагмент арнаменту пры распрацоўцы Дзяржаўнага сцяга. Арыгінал таго рушніка не захаваўся. Побач у вітрыне знаходзіцца карункавы абрус і тканы палавік Матроны Сяргееўны — яго, як і іншыя асабістыя рэчы — пенсійнае пасведчанне, старыя сямейныя фотаздымкі, перапіску з дзецьмі, — перадалі ў музей дачка Зінаіда Пашкевіч і ўнучка Дзіна Кацар.

Супрацоўнікі музея ўдакладняюць: паколькі арыгінальны рушнік не захаваўся, дагэтуль ідуць спрэчкі, быў малюнак на ім вышыты альбо вытканы на кроснах. Досыць доўга расшыфроўвалі і сімволіку арнаменту, якім майстрыца аздобіла рушнік яшчэ ў 1917 годзе. У агульных рысах было зразумела, што гэтыя сімвалы, якія часта сустракаюцца ў вышыўках беларускіх сялянак, абазначаюць жыццё, росквіт, багаты ўраджай і ўрадлівасць. Потым вылучылі асобныя фрагменты: так, цэнтральны ромб, ад якога адыходзяць загнутыя лініі, нібыта рогі, абазначае ўласна ўзыходзячае сонца; фігуры справа і злева ад яго — сімвал дабрабыту і багацця, а крыжападобныя пераплеценыя лініі з чатырма кропкамі вакол сімвалізуюць засеянае поле; ромбы, злучаныя парамі, — сімвал працягу жыцця.

Побач у экспазіцыі — пісьмовы стол, кнігі і асабістыя рэчы Міхаіла Кацара, а таксама пояс з яго калекцыі ўзораў беларускага ткацтва, сабранай падчас этнаграфічных паездак. Аднак значная частка сямейных рэліквій і дакументаў у музей так і не трапіла, і не таму, што сваякі майстрыцы былі супраць. Проста многія рэчы захоўваліся ў Міхаіла Кацара на дачы пад Мінскам — і згарэлі ў 1995 годзе падчас пажару, у якім трагічна загінуў і сам вучоны.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

А паміж інфармацыйнымі стэндамі прытуліліся некалькі малюнкаў, выкананых у даволі наіўным, амаль дзіцячым стылі, і ў той жа час няўлоўна блізкіх да фальклорных матываў — такія ўзоры нагадваюць, напрыклад, ліштвы вясковых хат. Гэта жывапісныя работы дачкі Матроны Маркевіч, Зінаіды Аляксееўны, якая ў свае 90 «з хвосцікам» працягвае такім чынам творчую лінію маці. Наогул, сваякі адной з самых вядомых беларускіх вышывальшчыц стараюцца часцей прыязджаць у Сянно, у гэты ж пункт на карце турыстычныя маршруты прыводзяць штогод мноства беларусаў і замежнікаў. А на цэнтральнай плошчы горада пяць гадоў таму ў гонар Матроны Маркевіч з'явіўся памятны знак «Родны край», аўтарамі якога сталі віцебскі скульптар Іван Казак і ліцэйшчык Ігар Шостак. На сёння гэта адзіны ў Беларусі помнік, прысвечаны дзяржаўнай сімволіцы, і менавіта тут праходзяць урачыстасці да Дня Перамогі і Дня Незалежнасці, адбываюцца знакавыя для горада і раёна мерапрыемствы. І, магчыма, гэта адна з найлепшых і самых дзейсных формаў ушанавання памяці і ўрокаў патрыятызму для тых, каму жыць у Беларусі заўтрашняй.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Пантэон Айчыны

# ЯКУБ ЯСІНСКІ (1761—1794)

**Якуб Ясінскі — герой паўстання 1794 года, адзін з яго правадыроў, які загінуў, баронячы свабоду Айчыны. Паходзіў Якуб з татарскага роду, але лічыў сябе літвінам. Ён мог стаць добрым пісьменнікам, маючы літаратурны талент, цудоўна ведаў беларускую мову і пісаў на ёй вершаваныя пракламацыі (не выключана, што яго аўтарству належыць і славутая «Песня беларускіх жаўнераў»). Але падзеі, якія прывялі Рэч Паспалітую да яе акупацыі расійскімі, прускімі і аўстрыйскімі войскамі, а пасля і да другога яе падзелу зрабілі з Ясінскага змагара за свабоду Айчыны.**

Падчас вучобы ў Варшаўскай рыцарскай школе Якуб захапіўся ідэямі французскіх асветнікаў і марыў аб рэвалюцыйных пераўтварэннях у Рэчы Паспалітай. Ужо тады адзначалі яго «неабмежаваную пыху» і «схільнасць да першынства ў заслугах». Свае амбіцыі Ясінскі хацеў рэалізаваць у творчасці, таму пасля вучобы ў рыцарскай школе не стаў служыць у войску, а прысвяціў сябе літаратуры. Яго творы — байкі, сатырычныя і лірычныя вершы — не маглі пракарміць аўтара-пачаткоўца. А двухгадовае настаўніцтва сыноў магната Пятра Патоцкага расчаравала, бо яго распешчаным вучням было «нельга даваць ніякіх маральных навук».

Ясінскі вярнуўся на вайсковую службу і ў 1790 годзе ў чыне падпалкоўніка атрымаў назначэнне на пасаду каменданта ў Віленскі корпус артылерыі і інжынераў. Ён з захапленнем прыняў дэмакратычную канстытуцыю 3 мая 1791 года і бараніў яе ў баях з расійскім войскам, якое ў 1792 годзе рушыла на Літву. Пад яго кіраўніцтвам быў распрацаваны план абароны Брэста. Ясінскі ўмацаваў фартыфікацыі, пабудаваў рэдут і мост цераз Буг для адступлення. Гэта і дазволіла ў бітве 23 ліпеня 1792 года тром тысячам жаўнерам адбіць пяць атак 8-тысячнага корпуса генерала Ферзена, а пасля заканчэння пораху адступіць за Буг, спаліўшы за сабой мост. За гэтую бітву палкоўнік Ясінскі атрымаў ад караля Станіслава Аўгуста ордэн «Virtuti militari». Як высветлілася, яго гераізм быў непатрэбны. Кароль прыняў бок ворагаў канстытуцыі і загадаў войску скласці зброю. Рэч Паспалітая трапіла пад кантроль расійскага войска і перажыла чарговы падзел сваёй тэрыторыі паміж Расіяй і Прусіяй. Ясінскі актыўна ўключыўся ў падпольны рух па падрыхтоўцы паўстання, аднак шмат каго пужалі яго радыкальныя погляды.

Паводле ўхваленага Хлявінскім плана Ясінскага паўстанцы ў ноч з 22 на 23 красавіка вызвалілі Вільню ад расійскіх войскаў. Больш за тысячу расійскіх салдат на чале з начальнікам гарнізона генерал-маёрам Мікалаем Арсеньевым здаліся ў палон. 24 красавіка камендант Вільні Якуб Ясінскі зачытаў на Ратушнай плошчы «Акт паўстання народу Вялікага Княства Літоўскага». У ім заклікалася абараняць да апошняй кроплі крыві Айчыну. Як любы радыкал, Якуб лічыў, што жорсткімі расправамі і карамі можна ўсталяваць справядлівасць. Радыкалізм Ясінскага трывожыў і галоўнага начальніка паўстання Тадэвуша Касцюшку, які не хацеў дапусціць «жахаў французскай рэвалюцыі». А па словах ад'ютанта Касцюшкі Юльяна Нямцэвіча, пакуль паўстаннем на Літве кіраваў «муж поўны адвагі» Ясінскі, «літвінаў не пакідаў дух смеласці».

Ён узначаліў збройныя сілы Гродзенскага павета, дзе сфарміраваў дывізію, на чале якой абараняў Варшаву. Толькі і ён, пасля падаўлення паўстання, паў духам.



«Я Бацькаўшчыны не перажыву, калі лёс не дасць мне загінуць у бітве, звярнуся да гэтых прыяцеляў», — сказаў Ясінскі сваім ад'ютантам і паказаў на пісталеты. Гэта быў адчай перад немінучым крахам сваіх ідэалаў і апошняе, што засталося яму, гераічна загінуць у бітве з ворагам. На чале дывізіі ў чатыры тысячы жаўнераў Ясінскі абараняў левы фланг Варшаўскага прадмесця — Прагі. Падчас штурму Прагі 4 лістапада камандуючы расійскім войскам Аляксандр Сувораў накіраваў на пазіцыі гродзенскай дывізіі чатыры з сямі калон сваіх сіл. Пад агнём 86 гармат паўстанцы стрымлівалі ворага, а ён кідаў у бой свежыя сілы. Сам Ясінскі, акружаны непрыяцелем, адстрэльваўся з карабіна, пакуль куля не абарвала яго палымянае жыццё...

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

**НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ**

**Мая Галіцкая нарадзілася і жыве ў Буда-Кашалёве. 20 гадоў працуе настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Недайскай базавай школе, якая знаходзіцца за 18 кіламетраў ад яе роднага райцэнтра. Мая Аляксандраўна даўно піша і прозу, і вершы, не раз станавілася пераможцай літатурных конкурсаў. У тым ліку і леташняга конкурсу на лепшы пераклад на беларускую мову раней не вядомага рускамоўнага верша Максіма Багдановіча, што ў 2018 годзе быў знойдзены ў рукапісным сшытку паэта. Конкурс праходзіў па ініцыятыве Дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы і інфармацыйнага агенства БелТА.**

**Хочацца пажадаць нашай аўтарцы творчых перамог і ў новым, 2020 годзе.**

**Алесь БАДАК.**

Мая ГАЛІЦКАЯ

# ВЫЖЫЎ

— Донька, мне гарэлкі і хлеба, простага, чорнага. Не, больш нічога не трэба. Толькі хлеб парэж, — сталы мужчына ў параднай ваеннай форме збянтэжана ўсміхнуўся. — Я б і сам з радасцю, ды вось... — Ён прыўзняў з-за барнай стойкі напалову пусты рукаў. — І яшчэ... дзве чаркі.

Маладзенькая афіцыянтка з завучанай усмешкай кіўнула галавой мужчыну і адышла. Ваенны павольна акінуў позіркам пустое кафэ, выбраў самы далёкі столік і гэтак жа павольна накіраваўся туды. Зняўшы фуражку і абтрусіўшы з яе снег, ён размясціўся за столікам, разглядзеў сцэны. Усё як і ўсюды: яркія плакаты ў рамках, рознакаляровае падсвятленне, люстраныя шары пад столлю. Прама насупраць яго вісеў вялізны плазменны тэлевізар ва ўсю сцяну, на экране якога ў бязгукавым рэжыме вырабляла мудрагелістыя па цемнаскурая пара.

— Добра, донька, — падзякаваў мужчына афіцыянтцы, якая паставіла перад ім запацелы графін з гарэлкай, дзве чаркі і плецены кошык з ахайна складзенымі кавалачкамі чорнага хлеба.

— Што-небудзь яшчэ? — з усмешкай пацікавілася вышкаленая афіцыянтка.

— Не, дзякуй, мая добрая. Адпачні. На вось, вазьмі, — ваенны расплаціўся і змоўк.

Цокаючы абцасікамі, дзяўчына пайшла. Мужчына, пасядзеўшы хвіліну нерухома, выцягнуў партманэ і дастаў адтуль невялікі стары фотаздымак. Бакі яго абтрапаліся ад працяглага нашэння ў цеснаце, папера пажоўкла, а чарнільны надпіс на адваротным баку амаль выцвіў. Акрамя таго, адзін бок фотаздымка быў запэцканы чымсьці цёмным. Чалавек наліў у чарку гарэлкі да краёў, накрыў кавалкам хлеба і паставіў перад сабой. На імгненне прыклаўшы фотаздымак да вуснаў, уладкаваў яго перад чаркай. Праз запацелы крышталь графіна прама на яго ў адзін момант накіраваўся позірк дваццаці пар вачэй.

— Ф'ю! Ф'ю-ю-ю! — гэты Лёшкаў свіст, здавалася, пачула ўся цясніна, наскрозь прапахлая бензінам, порахам і задушлівым дымам. Рэдкія хвіліны афганскай цішыні не былі расцягнутыя ў прасторы і часе, як гэта было на Вялікай зямлі. Праз імгненне з палінялых, прадзіраўленых асколкамі брызентавых намётаў высыпалі загарэлыя маладыя хлопцы і накінуліся на свістуна.

— Гэй, што там?

— Ну чаго свішчаш? Зарплату прывезлі?

— Зусім ачмурэў ад спёкі, ці што? — дужы хлапчына лінуў вады Лёшку ў твар.

— Глядзіце, хлопцы! Ды вунь, на руцэ глядзіце! Што ж цягне?

Салдаты павярнуліся туды, куды паказваў Лёшка, і заўважылі вялікую драпежную птушку, якая павольна лунала ў паветры дакладна над намётамі на брыючым палёце. У кіпцюрах яе выгіналася буйная змяя.

Цяпер хлопцы засвісцелі ўжо ў дзясятак ратоў, зашумелі, закрычалі і замахалі рукамі. Хтосьці падхапіў камень і кінуў у птушку. Лёшка з аўтаматам наперавес пасунуўся наперад, але тут нечакана птушка выпусціла здабычу, злосна зрабіла яшчэ адзін круг і ўзляцела ўверх. Лёшка рушыў было туды, куды, магчыма, упала змяя, але, зрабіўшы некалькі крокаў, супыніўся.

— Хлопцы, хадземце, паглядзім гада!

— Ты за паўгода на змей не наглядзеўся, ці што? Вунь за кожным каменем такія ж па пяць штук у засадзе сядзяць. Праваронiш — мацней за душмана ўкусіць!

Усе як адзін байцы махнулі рукамі і схаваліся ў намётах, пакінуўшы Лёшку ў адзіноце перад дылемай: схадзіць пагледзець змяю ці пайсці за імі ў выратавальны цень. Лёшка выбраў першае.

Змяя таўшчынёю ў руку дужага мужчыны ляжала на голых рудых каменнях, зацярушаных пластам попелу, пяску і нагару. Чарнёным срэбрам адлівала спіна, распаласаваная кіпцюрамі драпежніка. Кропелькі пунсовай крыві сцякалі на каменне і тут жа запякаліся на пяцідзесяціградуснай спякоце. Скіраваныя ў адну кропку шкляныя вочы не цьмянелі, і здавалася, што апошнія сілы выцякалі з яе разам з гэтымі кроплямі. Лёшка стаяў нерухома, скамянеўшы ад жаху і жалю, якія яго раздзiралі, але ўсё ж такі жаль адолеў, і ён, выставіўшы аўтамат, павольна пайшоў да змяі, прыгаворваючы:

— Добрая... Не палохайся... Не кусай...

Наблізіўшыся, Лёшка крануў гадзіну ствалом аўтамата. Змяя толькі трохі павярнула галаву і больш не рухалася. Крыху асмялеўшы, хлопец стаў падсоўваць яе да вялікага валуна, які адкідваў хоць які-небудзь цень. Падштурхнуўшы змяю за камень, Лёшка падсунуў хвост бліжэй да галавы, імкнучыся скруціць яе ў кола. Не паднімаючы галавы, змяя слаба засыкала, і салдат адскочыў далей, ужо здзіўляючыся абсурднасці сваіх дзеянняў.

Вярнуўшыся да намётаў, Лёшка адарваў кавалак ад запаснога намётавага брызенту, наліў у гільзу вады. Потым пакорпаўся ў аптэчцы, знайшоў парашок, якім іх ваенурач засыпаў невялікія раны, і адсыпаў сабе на далонь. Зноў пайшоў туды, за камяні, пад дружнае цюганне і непахвальныя эпітэты таварышаў па службе. Змяя заставалася там. Зградзіўшы вакол яе з малых камянёў нешта кшталту сценак, ён накрыў дзіўнае збудаванне брызентам, потым асцярожна паліў змяю вадой. Ціхенька набліжаючы руку, Алёшка пасыпаў раны ад кіпцюроў аптэчным парашком. Доўгае цела тузанулася, выгнулася і нібы заціхла...

А потым было пекла. На ўскрайку Герата, дзе замацавалася Лёшкава мотастралковая дывізія, хапала крывавых драм. З кожным днём месца ў намётах станавілася ўсё больш, а брудных кацялкоў пасля ежы ўсё менш. Спачатку з баявой аперацыі не вярнуўся Лёшкаў блізкі сябар, украінец Пятро. Цяжка паранены, памёр на руках сяброў армянін Сейран... А змяя, выдраная з кіпцюрыстых драпежных лап, жыла. Праз некалькі дзён пасля свайго выратавання яна ўсё ж такі скруцілася, але ўсё роўна ляжала нерухома. Лёшка ўжо не баяўся быць укушаным і час ад часу пасыпаў лекамі раны ды паліваў яе вадой. Добра, што рэчка Карубар у раёне старой крэпасці, што за Кандагарскім базарам, у гэтым месцы амаль не прастрэльвалася. Ён нават пару разоў пакідаў ваду і сёе-тое з ежы побач са змяінай галавой.

На пяты дзень пры набліжэнні Лёшкі змяя ўзняла галаву і ўтаропілася на яго, не міргаючы. Ашаломлены салдат замёр у некалькіх кроках ад яе хованкі, не адважваючыся падысці бліжэй. Яна ж слаба заварушылася і паспрабавала паўзці да яго. Лёшка не рухаўся і прыжмурыў вочы: нехта расказваў, што калі не рухацца, то змяя не ўкусіць. Нiхто яго не ўкусіў, і ён расплюшчыў вочы. Змяя ўсё ж такі наблізілася да яго, але цяпер ляжала, паклаўшы галаву на вялізны Лёшкаў бот...

Спякота стаяла градусаў за сорак у цені. Пад бязлітасным сонцам салдаты нервова моршчылі твары, перасохлымі глоткамі прагна хапалі распаленае паветра, напоўненае парамі бензіну, дызпаліва і парахавой гары. Ужо амаль восем гадзін цягнуўся бесперапынны бой, які час ад часу то ўзмацняўся, то слабеў. Бой, канца якому не было відаць, а таму і выклікаў ён тупую абыякавасць да ўласнага лёсу, навязлівае адчуванне рэальнасці таго, што адбываецца, і разам з тым жаданне канца. Якога канца — гэта было ўжо для Лёшкі не так важна, толькі б спыніўся ўвесь гэты жах. Лёшка памятаў толькі, што бясконца набіваў патроннік і перасоўваў затвор аўтамата, страляючы па баевіках, якія імкнуліся прасунуцца бліжэй... Сваё ўмацаванне тады яны ўтрымалі.

Загадалі раніцай зноў выйсці на пазіцыі, якія займалі раней, і захапіць першыя дувалы. Але камандзір палка пры гэтым брудна лаяўся ў адрас нейкага абцякаранага вялікай уладай асталопа, таму што ён, камандзір, добра разумеў, што азначае гэты загад. Загад, які паменшыў за мінулы дзень Лёшкаву дывізію дакладна ўтрая забітымі і параненымі. Разумелі гэта і афіцэры штаба, якія маўкліва стаялі побач, і заўсёды памяркоўны камандзір трэцяга батальёна, але правілы ваеннай субардынацыі патрабавалі сказаць адно толькі слова «Ёсць!» І гэтае слова было сказана...



Трапіўшы ў намёты ўжо глыбокай ноччу, хлопцы, якія засталіся ў жывых, напіліся вады і, не распранаючыся, як нежывыя, пападалі на насцілы з дошак. Лёшка, спехам перавязаўшы закрануты асколкам распухлы палец, як і звычайна, зачарпнуўшы вады, накіраваўся да змяі. Паліўшы яе вадой, ён асуджана прысеў на каменне побач, абхапіў галаву рукамі і заціх у нейкім забыцці. У тое ж імгненне адужэлая змяя развітай спружынай кінулася да яго на шыю і сцягнулася ў тугі вузел, не пакідаючы знясіленаму салдату ні найменшай магчымасці нават зварухнуцца з месца. Хапаючы ротам ні на градус не астылае паветра, Лёшка схапіў змяю дзвюма рукамі, але яна сталёвай пятлёй сціскалася ўсё мацней. У Лёшкі пацямнела ў вачах, у скронях застукаў пульс, рукі саслаблі, і ён страціў прытомнасць.

Калі Лёшка апрытомнеў, ён зразумеў, што прайшло зусім няшмат часу, таму што вакол стаяла ўсё тая ж непраглядная цемра ночы, узмоцненая задушлівым чорным дымам. Змяя, відаць, папаўзла, бо ні пад каменем, ні паблізу яе не было. Паматляўшы галавой, ён падняўся і, пахістваючыся, пабрыў да намётаў. Тое, што ён пабачыў, увяло яго ў нямое атупенне. Увесь яго намёт быў заліты крывёю. Кроў была ўсюды: на брызентавых дзіравых сценках, на раскіданых рэчах і нават у бачку з вадой. Трое хлопцаў, якія дзялілі з ім намёт увесь армейскі час, валяліся на падлозе з перарэзаным горлам.

Лёшка, заціскаючы рукамі рот у нямым крыку і стрымліваючы надыходзячую млоснасць, выпаў з намёту, у адзін момант пераадолеў некалькі крокаў і тузануў крыло суседняга. Тое ж самае... Усіх... Усіх хлопцаў выразалі душманы... Усіх... Яму здавалася, што ён яшчэ чуе шарганне падэшваў бандытаў, якія ўцякалі, адчувае іх жывёльны пах і бачыць, як растваракоцца ў апраметнай цемры цені...

Падзеі наступнага тыдня Лёшка памятаў урыўкамі.Трое сутак у адзіноце ён даганяў цэлую банду ўзброеных да зубоў маджахедаў. У зусім незнаёмай яму цясніне. Ішоў за здабычай, як воўк. Не еў і не піў нічога. Чамусьці ён адчуваў менавіта сваю віну за тое, што загінулі ЯГО хлопцы, і ён хацеў адпомсціць, чаго б гэта яму не каштавала. І за сябе, і за іх. Ён высачыў забойцаў і цяпер ішоў за імі след у след, жадаючы заспець патрэбны момант і напасці. Але ці справіцца, ён не ведаў і быў гатовы загінуць.

На чацвёртую ноч Лёшка адчуў, што сілы пакідаюць яго змучанае цела. Бандыты думалі, што ў тую ноч загінулі ўсе, і не надта сцерагліся пагоні. І калі ён па-кацінаму бясшумна падпоўз да вогнішча каля невялікай, ужо бачанай ім калісьці пячоркі, вакол якой вартавалі супакой два афганцы, у адным скачку — адчайным, злым і амаль безнадзейным — адзінай зброяй, якая была, штык-нажом, закалоў іх. Затым кінуўся ў пячору. Каб сонныя бандыты не крычалі, ён заціскаў ім раты далонню і толькі потым рэзаў горлы. У апошняга з ворагаў на шыі ён заўважыў падвеску — палоўку сэрца. Гэтая падвеска была на шыі Лёшкавага сябра з іх намёта. Паласуючы па горле маджахеда, Лёшка па-дзіцячаму заплакаў, з азвярэннем утыркаючы ўжо тупую зброю ў яшчэ цёплае абмяклае цела. Ён каўтаў слёзы, усхліпваў і шаптаў:

— Ну што, узялі, гады? Узялі, а?

Чатырнаццаць трупаў засталося за яго спінай, калі ён зноў выйшаў да вогнішча...

Праз тыдзень напаўжывы, абарваны і схуднелы Лёшка аб'явіўся ў размяшчэнні нейкай іншай вайсковай часці. Яго адразу ж адправілі ў шпіталь. Не толькі таму, што ён меў жудасны выгляд і вельмі аслабеў, а левая рука пачарнела і была падобная на палена. А яшчэ і таму, што ён папрасіў адразу аддаць яго пад трыбунал.

Лёшка цалкам апрытомнеў толькі ў верталёце, які вёз яго на Вялікую зямлю. Паранены асколкам палец даў заражэнне, і руку да локця прыйшлося ампутаваць. У шпіталі яму даводзілася бясконца адказваць на роспыты паважных вайскоўцаў з палкоўніцкімі і генеральскімі пагонамі, падпісваць незлічоную колькасць нейкіх папер і бясконца пісаць даклады, рапарты і тлумачальныя... Падлячыўшыся, ён доўга і беспаспяхова прасіўся назад, у Афган, але няўмольны ваенкам, адзначыўшы нешта ў яго ваенным білеце, суха пацiснуў яму ацалелую руку і адпусціў на ўсе чатыры бакі...

Гучным «Развітаннем славянкі» затрэнькаў мабільны тэлефон адзінага наведвальніка кафэ. Сталы ваенны, які да гэтага некалькі гадзін сядзеў нерухома, не адразу ўзяў трубку.

— Так, сынок, пад'язджай. Добра, і маці забяром.

Мужчына павольна падняўся, забраў са стала фотаздымак і зноў паклаў яго на звыклае месца, у партманэ. Залпам выпіў з крыштальнага графіна астатнюю вадкасць і накіраваўся да выхаду.

Так як нікога, акрамя яго, у кафэ не было, «плазма» перадавала навіны. Сухі дыктарскі голас вяшчаў з глыбіні экрана:

— За 10 гадоў страшнай і кровапралітнай вайны СССР страціў амаль пятнаццаць тысяч салдат. Паводле афіцыйных звестак, раненні, кантузіі і розныя пашкоджанні атрымалі больш за пяцьдзясят тры тысячы чалавек, каля трохсот чалавек прапалі без вестак. І сёння, у гадавіну вываду савецкіх войск з Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан...

Не даслухаўшы, ваенны павярнуў галаву і рыўком тузануў каўнер параднага кіцеля, адарваўшы ад беласнежнай кашулі некалькі гузікаў. Агалілася доўгая загарэлая шыя, на якой сіняй пятлёй абвілася татуіраваная змяя.

# МОВАЮ ТАНЦА

**Нядаўна ў Мінску на сцэне філармоніі з вялікім поспехам прайшоў канцэрт Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі». Канцэрт стаў заключным у рамках вялікага гастрольнага туру, прысвечанага 45-годдзю калектыву.**



Фота БелТА.

Як заўсёды, гэта было дзівоснае і непаўторнае свята высокага прафесійнага мастацтва. Жывая музыка, яркія нацыянальныя касцюмы, тэмпераментныя, эмацыянальна насычаныя танцы — усё гэта стварала на сцэне і ў зале незабыўную атмасферу радасці, святочнасці, на якую гледачы шчыра адгукаліся гарачымі апладысментамі...

«Харошкі» — калектыў аўтарскі. Яго стваральнік і нязменны кіраўнік — Валянціна Гаявая. Народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі краіны, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне», кавалер ордэна Францыска Скарыны і ордэна Дружбы народаў. Таленавіты харэограф, выдатны педагог, якая выхавала не адно пакаленне артыстаў.

Сёння ў «Харошках» многа моладзі, але працуюць і ветэраны калектыву — майстры, якія стаялі каля вытокаў ансамбля, а сёння з'яўляюцца яго гонарам. Гэта перш за ўсё заслужаныя артысты Фёдар Балабайка, Святлана Кашталапава-Патаповіч, Алеся Кур'ян, віртуозы сваёй справы Валянцін Гехт, Андрэй Асаёнак і многія іншыя.

Асобна трэба сказаць пра Фёдара Балабайку. Ён адзін з самых сталых удзельнікаў, працуе літаральна з першых дзён заснавання ансамбля. У свой час некаторыя гледачы хадзілі спецыяльна на Балабайку, які радаваў сваім унікальным талентам ствараць на сцэне камічныя, гумарыстычныя эпізоды. Атрымаўшы пенсію, Фёдар Якаўлевіч стаў з'яўляцца на публіцы радзей, эпізадычна. І вось у нядаўнім канцэрце зрабіў для гледачоў сюрпрыз — выступіў з прэм'ерай арыгінальнага музычнага нумара. І іграў з бляскам, засведчыўшы, што сваё ранейшае майстэрства не страціў.

Ва ўнісон танцам — адмысловыя, вытанчаныя строі. Касцюмы ў «Харошак» — сапраўдныя творы мастацтва, якія маюць не толькі мастацкую, але і этнаграфічную каштоўнасць. Артысты выступаюць у тканых і вышытых каляровымі ўзорамі спадніцах, кофтах, фартухах, мужчынскіх сарочках і кафтанах, у разнастайных галаўных уборах. Па гэтых строях можна прасачыць гісторыю адзення беларусаў, якія жылі ў розных мясцовасцях на працягу стагоддзяў.

Юбілейны год для калектыву ансамбля быў вельмі насычаны і напружаны.

— Мы, — расказвае Валянціна Гаявая, — далі своеасаблівыя справаздачныя канцэрты ў Драгічыне, Ганцавічах, Круглым і ў іншых райцэнтрах. Выступалі ў Крамлёўскім палацы, на сцэне культурнага цэнтра Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава, у Літве. Вялікая работа зроблена на II Еўрапейскіх гульнях: выступілі генеральным падрадчыкам арганізацыі культурнай праграмы для спартсменаў — удзельнікаў Гульняў. Узялі ўдзел больш чым у трыццаці канцэртах у фан-зонах і закрытых мерапрыемствах для замежных гасцей.

Але, бадай, самы яркі юбілейны канцэрт адбыўся напрыканцы мінулага года ў Вялікім тэатры оперы і балета, на якім «Харошкі» парадавалі гледачоў прэм'ерай «Купальскай сюіты» ў трох частках на музыку У. Гінько і І. Ерамяевіча. Арыгінальнымі сцэнічна-харэаграфічнымі сродкамі артыстам удалося паказаць, як мянялася, перааснсоўвалася жыццё беларусаў ад паганскіх часоў да прыняцця хрысціянства, прадэманстраваць шлях чалавечай душы ад розных жарсцяў да Усявышняга.

Юбілейныя канцэрты «Харошак» пераканаўча засведчылі, што калектыў знаходзіцца ў выдатнай творчай форме. Дзякуючы свайму непаўторнаму стылю, багатай фантазіі і арыгінальнасці задум, неверагодна высокаму выканальніцкаму майстэрству ансамбль займае ў сучасным беларускім мастацтве асаблівае, незаменнае месца. За сорак пяць гадоў сваёй сцэнічнай дзейнасці «Харошкі» сталі з'яваю ў нашым музычным мастацтве, своеасаблівым брэндам Беларусі. Мовою танца яны не толькі адлюстроўваюць яркія старонкі нашай гісторыі, але і раскрываюць душу беларуса.

Хочацца пажадаць таленавітым артыстам ансамбля і яго натхнёнаму, няўрымсліваму кіраўніку Валянціне Гаявой здзяйснення задуманых творчых планаў (а яны ў калектыва багатыя!), новых вяршынь у насычанай прафесійнай дзейнасці.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ,**
**заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь.**

Выстаўка

# ШАГАЛАЎСКАМУ — ГРАФІКУ РЫБАКА

**Віцебскі Музей Марка Шагала атрымаў у падарунак ад маскоўскіх калекцыянераў графіку Ісахара-Бер Рыбака, які ў першай палове мінулага стагоддзя ўвайшоў у спіс самых вядомых прадстаўнікоў яўрэйскай культуры і мастацтва. Цікава, што ён у 1915—1916 гадах удзельнічаў у этнаграфічнай экспедыцыі ва Украіне разам з Эль Лісіцкім, які потым выкладаў у Віцебску і быў аднадумцам Казіміра Малевіча...**

Прыемная навіна была агучана на першай у Беларусі выстаўцы твораў майстра. Экспазіцыя арганізавана пры садзейнічанні сэрвісу «Ад і да. Мастацтва без пасрэднікаў» і фонду культурных і адукацыйных праграм «Адкрытае мора». Яны і падарылі прадстаўленыя ў Віцебску манахромныя і каляровыя літаграфіі.

— Гэтай экспазіцыяй Музей Марка Шагала працягвае серыю выставак з прыватных калекцый, прысвечаных вяртанню імён мастакоў XX стагоддзя, якія зрабілі ўнёсак у развіццё яўрэйскай культуры і мастацтва. Аснову яе складаюць манахромныя літаграфіі Ісахара-Бер Рыбака з выдання «Штэтл. Мястэчка. Мой разбураны дом. Успамін», надрукаваныя ў Берліне ў 1923 годзе. На выстаўцы прадстаўлены 28 манахромных і восем каляровых літаграфій — больш позняй інтэрпрэтацыі гэтай жа тэмы, — адзначыла на адкрыцці выстаўкі **Ірына ВОРАНАВА, кіраўнік установы культуры.**

Перыяд авангарду першай трэці XX стагоддзя характарызаваўся росквітам нацыянальных культур. Імя Рыбака ўвайшло ў гісторыю развіцця новага яўрэйскага мастацтва разам з такімі ключавымі постацямі, як Лісіцкі, Шагал, Альтман, Арансон, Юдовін, Чайкоў.

Усе работы Рыбака ў той час — жывапіс, графіка — прысвечаны яўрэйскім сюжэтам.

У горадзе Бат-Ям (Ізраіль) існуе Музей Ісахара-Бер Рыбака.

Даследчыкі знаходзяць у яго мастацтве ўплыў Лісіцкага і Альтмана, а таксама Шагала, адзначаюць рэмінісцэнцыі эстэтыкі яўрэйскага народнага мастацтва, лубка і кубізму. Але Рыбаку не ўласцівыя ні эксперыментатарства Лісіцкага, ні метафізіка Шагала, ён вельмі праўдзівы мастак, пазбаўлены сентыментальнасці. Тым не менш яму ўласціва пачуццё трагічнага, якое выяўляецца ў партрэтах.

Выстаўка працуе да 16 лютага.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



На адкрыцці выстаўкі Рыбака.

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛЮТЫ

***4 лютага*, аўторак.** Ад стрыжкі лепш адмовіцца, яна негатыўна адаб'ецца на структуры валасоў. Добра змяняць знешні выгляд з дапамогай новых прычосак альбо афарбоўкі ў нейкі нязвыклы колер.

***5 лютага*, серада.** Дзень выдатна падыходзіць для любых пачынанняў. Новая стрыжка дазволіць змяніць знешнасць, надаць валасам здаровы і дагледжаны выгляд.

***6 лютага*, чацвер.** Гэты дзень падыходзіць для афарбоўкі і завіўкі валасоў, аздараўлення і аднаўлення іх адмысловымі саставамі. Негатыўна на іх можа адбіцца толькі стрыжка, якая аслабіць іх стан і прыцягне няўдачы да ўладальніка.

***7 лютага*, пятніца.** Стрыжка ці новая ўкладка прынясуць у жыццё ўдачу і павышэнне дабрабыту, а валасам нададуць бляск і жыццёвую сілу.

***8 лютага*, субота.** Паход да цырульніка здольны знерваваць, сапсаваць як настрой, так і стан валасоў. У гэты месячны дзень маніпуляцыі з валасамі могуць аслабіць арганізм і павялічыць рызыку хвароб.



***9 лютага*, нядзеля.** Сёння не плануйце змены прычоскі або даўжыні валасоў, бо гэтыя задумкі могуць прывесці да сумных наступстваў для знешняга выгляду.

***10 лютага*, панядзелак.** Дзень выдатна падыходзіць для перамен у знешнасці. Стрыжка і афарбоўка будуць эфектныя і нададуць прывабнасці, падвысяць увагу з боку процілеглага полу.

***11 лютага*, аўторак.** Адкладзіце наведванне цырульні на іншы дзень, бо сёння стрыжка або новая прычоска прывядуць да пагаршэння здароўя не толькі валасоў, але і ўсяго арганізма ў цэлым.

***12 лютага*, серада.** Стрыжку лепш адкласці, сёння яна прынясе незадавальненне сваім выкананнем і аслабіць здароўе.

***13 лютага*, чацвер.** Няўдалы час для змены іміджу — стрыжка зменіць знешнасць не ў лепшы бок, зробіць выгляд неэстэтычным, пагоршыць стан валасоў.

***14 лютага*, пятніца.** Сёння — час мяняць усё навокал, таму будуць удалымі аперацыі па змене прычоскі, даўжыні валасоў альбо іх колеру.

***15 лютага*, субота.** Наведванне цырульні не варта адкладаць, стрыжка і афарбоўка палепшаць фінансавыя справы і падымуць настрой.

***16 лютага*, нядзеля.** Ад сур'ёзных змен у знешнасці лепш устрымацца. Новая прычоска выйдзе няўдалая і сапсуе настрой надоўга.

***17 лютага*, панядзелак.** Сёння не плануйце паход да цырульніка, бо стрыжка можа прывесці да пагаршэння зроку і агульнага стану здароўя, змена іміджу і прычоскі прыцягне негатыўную энергетыку.

***18 лютага*, аўторак.** Неспрыяльны для стрыжкі дзень. Устрымайцеся ў гэты час і ад хімічных змяненняў структуры валасоў — афарбоўка і іншыя працэдуры эфекту не дадуць, але могуць прыцягнуць у ваша жыццё канфлікты і сваркі.

***19 лютага*, серада.** Стрыжка альбо прычоска, зробленыя сёння, пагоршаць знешні выгляд і адмоўна адаб'юцца на здароўі арганізма.

***20 лютага*, чацвер.** Новая стрыжка або прычоска дададуць сіл і ўпэўненасці ў сабе, аздаравяць валасы, нададуць ім бляск і прыгажосць.

***21 лютага*, пятніца.** Адпраўляючыся на стрыжку або змяненне прычоскі сёння, варта памятаць, што, кароцячы валасы, вы рызыкуеце прыцягнуць да сябе няўдачы.

***22 лютага*, субота.** Час для пазбаўлення ад усяго старога і непатрэбнага. Таму стрыжка будзе вельмі дарэчы — разам з ёй сыдзе частка негатыўных уздзеянняў, атрыманых за месяц.

***23 лютага*, нядзеля.** Стрыгчыся сёння нельга — валасы пазбавяцца часткі энергіі. Добры вынік дадуць афарбоўка натуральнымі фарбавальнікамі і працэдуры для аздараўлення валасоў.

***24 лютага*, панядзелак.** Сёння — дзень пачынанняў, таму можна смела адпраўляцца да майстра па новы вобраз. Стрыжкі ў гэты дзень нададуць валасам энергію і падымуць настрой.

***25 лютага*, аўторак.** Сёння выдатным рашэннем будзе паспрабаваць новую ўкладку ці прычоску. Карысна праводзіць аздараўленчыя працэдуры для валасоў.

***26 лютага*, серада.** Сёння — непрыдатны час для новых стрыжак і прычосак. Валасы могуць страціць частку свайго здароўя і дагледжанага выгляду.

***27 лютага*, чацвер.** Любыя сённяшнія маніпуляцыі з валасамі аслабяць арганізм і сапсуюць настрой, з'явіцца незадаволенасць сваім выглядам.

***28 лютага*, пятніца.** Дзень ідэальна падыходзіць для наведвання цырульніка. Самы час для эксперыментаў з прычоскамі і колерам валасоў.

***29 лютага*, субота.** Стрыжку і іншыя маніпуляцыі з валасамі лепш не планаваць. Паход у цырульню можа разбурыць энергетычныя сувязі і аслабіць арганізм.

# ФАРПОСТЫ ДУШЫ



Бібліятэкар Каменскай сельскай бібліятэкі Алена МУРАШКА абслугоўвае сваіх чытачоў – Дану БАНДАРАВУ з сынам.

**Ведаеце, дзе цяпер больш за ўсё чытаюць папяровыя кнігі? У вёсках. Людзі, якія захавалі найбольш блізкую сувязь з прыродай, з зямлёй, не спяшаюцца пераходзіць на электронныя носьбіты інфармацыі і духоўнага пажытку. Не з-за таго, што не ўмеюць карыстацца імі — яны актыўна ўжываюць смартфоны, не горш за сваіх дзяцей і сяброў з горада. Але з задавальненнем ідуць у свае вясковыя бібліятэкі і няспешна выбіраюць там ужо досыць зачытаныя тамы з класікай або мемуарамі, дэтэктывамі, любоўнымі раманамі... І верагодна, яны куды больш за гараджан захавалі ў сваёй душы гармонію і спакой, устойлівую раўнавагу. Гэта я зразумела, калі бліжэй пазнаёмілася з Дзяржаўнай установай культуры «Чавуская бібліятэчная сетка».**

## ЛАЎЦЫ БІБЛІЯТЭЧНЫХ ДУШ

Яна была ўтворана ў 2015 годзе. На той момант у раёне зачынілі тры вясковыя бібліятэкі. Дэмаграфічны спад — галоўны вораг беларускай вёскі. У населеных пунктах, дзе перастаюць нараджацца дзеці, спачатку зачыняюцца дзіцячы садок і школа, потым — пошта і крама. Бібліятэкі, па словах дырэктара Чавускай бібліятэчнай сеткі **Алены МАКСІМОВІЧ**, сыходзяць апошнімі.

І ўсё ж такі, за апошнія пяць гадоў колькасць «храмаў кніг» у Чавускім раёне ўдалося не толькі захаваць, але на адну адзінку павялічыць. Цяпер у структуры сеткі 16 бібліятэк: дзве ў горадзе (Цэнтральная і дзіцячая), 11 у аграгарадках і тры ў вёсках, чатыры аб'яднаныя ў бібліятэкі-клубы.



**Дырэктар Чавускай бібліятэчнай сеткі Алена МАКСІМОВІЧ.**

— Бібліятэкары на добрым узроўні выконваюць абавязкі клубнага работніка. Па-першае, нашы спецыялісты — прасунутыя карыстальнікі інфармацыйных тэхналогій, па-другое, нас навучаюць арганізацыі масавых мерапрыемстваў, — упэўнена Алена Максімовіч.

Бібліятэкі-клубы ладзяць дыскатэкі, усе галоўныя святы і аб'ядноўваюць жыхароў вёсак у творчыя групы.

Увогуле, бібліятэкі праводзяць вельмі шмат мерапрыемстваў, і як правіла, з чаяваннем, — дадае дырэктар. — Усе нашы бібліятэкары — жанчыны, добрыя гаспадыні. Мы прывабліваем чытача ўсімі магчымымі спосабамі.

На сяле, у адрозненні ад горада, няма праблемы малой колькасці чытачоў, бо акрамя як у бібліятэку, у многіх вёсках ужо больш няма куды пайсці, кажа кіраўнік установы культуры. Бібліятэчная сетка абслугоўвае каля паловы ўсяго насельніцтва раёна.

## ПАСЛЯ ЗАЛАТОГА ВЕКУ

— Мы ганарымся сваёй падпіскай на перыядычныя выданні — на сёння гэта 156 найменняў, напалову — папулярная перыёдыка, на некаторыя выданні — чарга, — расказвае Алена Максімовіч. — Вясковыя бібліятэкі выпісваюць каля 25-27 газет і часопісаў.

Самым спрыяльным перыядам у фарміраванні бібліятэчных фондаў кіраўнік раённай структуры называе час рэалізацыі першага этапу Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Літаратуру для раёнаў тады закупляла абласная бібліятэка, выходзячы з іх запытаў. У той час усе ўстановы атрымалі камп'ютары.

— Гэта было шыкоўна, — успамінае мая субяседніца. — У нас былі жывыя картатэкі, сфарміраваныя з улікам чытацкіх інтарэсаў. Мы тады закамплектаваліся энцыклапедычнымі выданнямі. Гэта былі залатыя гады для бібліятэк.

Зараз купляць новыя кнігі ў рэгіянальных бібліятэк магчымасцяў няшмат, але, зрэшты, у Чавусах выкарыстоўваюць любую. Удаецца выкраіць грошы на галіновую літаратуру, кодэксы, у абавязковым парадку раён купляе сацыяльна значную літаратуру. «Белкніга» штогод бясплатна перадае частку не распраданых тыражоў, такім чынам летась Чавускі раён атрымаў каля 200 выданняў. Акрамя таго, раённая сетка актыўна карыстаецца абменнымі фондамі Нацыянальнай і абласной бібліятэк. Каля 500 кніг (як дэтэктывы, так і зборы твораў класікаў) летась падарылі чытачы. **Дарэчы, класіка карыстаецца павышаным попытам на сяле, таму падораныя зборы твораў савецкіх часоў актыўна выкарыстоўваюцца ў бібліёбусах.**

Бібліятэкі Чавускага раёна маюць магчымасць абслужыць і чытача, вочы якога ўжо дрэнныя памочнікі. Тут маецца багатая картатэка аўдыёвізуальных кніг, фільмаў з аўдыёдэскрыпцыяй (вусным апісаннем візуальнай інфармацыі). Пазалетась удала звярнуліся да выдавецтва «Народная асвета», і атрымалі ў падарунак дзесяць кніг, напісаных шрыфтам Брайля.

## НЕ ТОЛЬКІ КНІГА

Кніга, вядома, галоўны аб'ект работы любой бібліятэкі, але сёння яны робяць яшчэ шмат чаго: выхоўваюць, навучаюць, дапамагаюць наладзіць дыялог паміж уладай і насельніцтвам. Цяпер у чытальнай зале Цэнтральнай бібліятэкі Чавус аформлена выстава-экспазіцыя, прысвечаная 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Тут абсталяваны цэнтр прававой інфармацыі і раз на месяц вядзе бясплатны прыём натарыус.

За ўласныя сродкі бібліятэка набыла фотапрынтары, ламінатар, перфабіндар, разак, што дазваляе выконваць платныя паслугі. Бібліятэка мае невялікую крамку з уласнымі вырабамі. Летась установа зарабіла больш за 20 тысяч рублёў.

Чавуская бібліятэчная сетка — удзельнік міжнароднага праекта «Агульны горад» («Камгар», фінансуецца Еўрапейскім саюзам), які быў рэалізаваны ў 2018—2019 гадах на тэрыторыі трох гарадоў: Баранавічы, Магілёў і Чавусы. У рамках праекта добраўпарадкаваны гарадскі парк, а бібліятэка атрымала шэсць тысяч еўра, на якія купіла мэблю, камп'ютары, каляровы прынтар, абсталявала «Зялёны інфармацыйны цэнтр» і распрацавала «Зялёную карту» горада.

У чытальнай зале Цэнтральнай бібліятэкі збіраюцца на свае пасяджэнні два клубы — «Краязнавец» для падлеткаў і «Хрызантэма», які аб'ядноўвае жанчын ва ўзросце «залатой восені».



**Цэнтральная і дзіцячая бібліятэкі ў Чавусах справілі наваселле і ўтульна размясціліся ў нядаўна адкрытым пасля рэканструкцыі раённым Доме культуры.**

Чавуская бібліятэчная сетка супрацоўнічае з Калінінградскай дзіцячай бібліятэкай і з бібліятэкай у горадзе Зеленаградску Калінінградскай вобласці. Сяброўства з апошняй пачалося дзякуючы актыўнаму чытачу і аўтару кніг «Доўг» Васілю Іосіфавічу Чарнову, ветэрану Вялікай Айчыннай вайны, які ў складзе 385 стралковай дывізіі вызваляў Чавусы. Ужо двойчы госці з Зеленаградска прыязджалі ў Чавусы, тры разы паміж бібліятэкамі праводзіліся тэлемасты. Летась бібліятэкі ладзілі конкурс сярод школьнікаў на лепшае даследаванне пра герояў вайны — беларусаў, якія ваявалі ў Расіі. Сёлета плануюць заахвоціць дзяцей знайсці сведчанні, якія адлюстроўваюць жыццё і ваенную гісторыю савецкіх салдат, якія прымалі ўдзел ва Усходне-Прускай стратэгічнай аперацыі (з 13 студзеня па 9 мая 1945 года).

## «0+» ДАЎНО ЎЖО НОРМА

У дзіцячую бібліятэку Чавус цягам года прыходзіць каля паўтары тысячы чытачоў — не толькі мясцовыя дзеці, але і тыя, хто прыязджае летам на канікулы з усяго былога Савецкага Саюза. А яшчэ бацькі, настаўнікі, кіраўнікі дзіцячых гурткоў.

«Ёсць маладыя бацькі, якія бяруць кнігі для чытання трохмесячным немаўлятам, — не хавае гонару **загадчыца дзіцячай бібліятэкай Таццяна ФІЛІПЕНКА.** — Сувязі з нашай бібліятэкай сем'і перадаюць з пакалення ў пакаленне. Напрыклад, калісьці да нас сваіх дзяцей прыводзіла Тамара Аркадзеўна Ісаенка, а цяпер яна прыводзіць сваіх унукаў. Некаторых бацькоў мы ведаем з іх школьных часоў.

Гэтыя сувязі падтрымліваюцца і тэматычнымі сустрэчамі з салодкім сталом. Дзяцей малодшага школьнага ўзросту збірае і прывучае да здаровага ладу жыцця клуб «Вітамінка», аматараў сямейнага чытання — аб'яднанне «Кніжны выхадны».

Тут робяць усё магчымае, каб улюбіць сучасных дзяцей у папяровую кнігу. Яшчэ адна актуальная праблема — адарванасць сучаснай моладзі ад роднай мовы. «Вельмі сумна, калі маладыя бацькі прызнаюцца, што не ўмеюць размаўляць на беларускай мове, — з горыччу кажа Таццяна Філіпенка. — Іх дзеці таксама зусім не разумеюць беларускай мовы, і гэта — сур'ёзная праблема. Мы спрабуем дапамагчы».

Падчас канікул і святочных дзён бібліятэка працуе з дзецьмі і маладымі людзьмі, якія маюць асаблівасці развіцця.

## «ЗАЎСЁДЫ ВЕДАЛА, ДЗЕ ЯЕ МОЖНА ЗНАЙСЦІ»

З горада мы адпраўляемся ў дзве вясковыя бібліятэкі.

Каменская налічвае 63 гады сваёй гісторыі, і таму, што гісторыя гэта слаўная, ёсць не адно сведчанне.

Тут мы пазнаёміліся з **маці алімпійскай чэмпіёнкі Дынары Алімбекавай Ірынай ХІТРОВАЙ.** «Дынара ў гэтай бібліятэцы калісьці прападала. Я заўсёды ведала, дзе яе і сына можна знайсці, — з цёплай усмешкай успамінае Ірына Аляксандраўна. — Самі ведаеце, калі жывеш у вёсцы, клопату шмат, і дзеці большую частку часу пакінутыя самім сабе. Але **ў нас тут такая завядзёнка — дзеці часта ходзяць у бібліятэку і клуб,** тут усё ў адным будынку. Калі яны не на другім паверсе, значыць — на першым. Іх тут захапляюць: увесь час нейкія гурткі, дзеці нешта вырабляюць, малююць, бісерам вышываюць і да таго падобнае».



**Загадчык аддзела абслугоўвання Цэнтральнай бібліятэкі горада Чавусы Лілія КАЛІНІНА *(злева)* і бібліёграф Ганна БЯСПЁРСТАВА.**

У бібліятэцы ёсць невялікая экспазіцыя, прысвечаная Дынары, з яе асабістымі рэчамі і аўтографам. І альбом, у якім захоўваюцца дзіцячыя фатаграфіі знакамітай біятланісткі тут, у сценах бібліятэкі, калі яна яшчэ падлеткам была ўдзельніцай клуба «Сябры лесу».

**Любая бібліятэка ў вёсцы, акрамя абслугоўвання чытачоў, дапамагае старшыні сельскага Савета** ў абходзе двароў, абмерах зямлі, удзельнічае ў перапісе насельніцтва, выбарах, даглядае воінскія пахаванні. У Чавускім раёне больш за 100 помнікаў і пахаванняў часоў апошняй вайны, яны замацаваны за бібліятэкамі, клубамі і школамі раёна.

— Гэта правільна, — лічыць Алена Максімовіч. — У нашым раёне ішлі безлітасныя баі, цяпер кожнае лета пошукавікі знаходзяць невядомыя раней пахаванні салдат, перахоўваюць, на перапахаванні прыязджаюць сваякі загінулых воінаў з усіх канцоў былога Савецкага Саюза — і нам не сорамна за стан салдацкіх магіл перад імі.

## «У АСНОЎНЫМ У МЯНЕ ЧЫТАЮЦЬ СЕМ'ЯМІ»

У аграгарадку Вусце будынак культурна-спартыўнага цэнтра, у якім знаходзіцца бібліятэка, быў пабудаваны ў рамках Праграмы адраджэння і развіцця сяла 10 гадоў таму.

**Бібліятэкар Святлана АНІКЕЕВА** кажа пра сваю працу так, як расказваюць пра ўласную сям'ю.

— Ён у мяне самы лепшы, — гэта пра фонд дзіцячай літаратуры. — У мяне ёсць чытачы, якія чытаюць запоем, я іх усіх магу назваць па імёнах. У асноўным у мяне чытаюць сем'ямі. Калі чытае бабуля, то чытаюць і дзеці, і ўнукі. Стараюся раз на месяц наведаць пенсіянераў у аддаленых вёсках, а гэта кіламетраў за 15 адсюль.

— Святлана Міхайлаўна — чалавек з вельмі актыўнай жыццёвай пазіцыяй, — умешваецца ў нашу размову **мастацкі кіраўнік культурна-спартыўнага цэнтра Таццяна КАРАЛЕНКА.** — Гэта наш памочнік ва ўсім, а галоўнае — у метадычнай рабоце. Яна яшчэ — вясковы староста і дэпутат.

Сама бібліятэкар пастаралася перавесці размову на жанчыну, якая вяжа сурвэтку, звяраючы малюнак па схеме ў часопісе: «Наталля Леанідаўна Гушчына — зубны ўрач і наша чытачка, якой я вельмі ўдзячная, яна дае свае вырабы для афармлення выставак, актыўна чытае і дорыць кнігі ў бібліятэку. А яшчэ яна — цудоўны кулінар».

Самая любімая катэгорыя чытачоў у гаспадыні Вусцянскай бібліятэкі — дзеці. Каб пазнаёміць іх з кнігай бліжэй, яна ладзіць масавыя мерапрыемствы, праводзіць гутаркі, вікторыны. «Уся работа пабудавана з клубам і амбулаторыяй, — раскрывае асаблівасці грамадскага жыцця аграгарадка бібліятэкар. — Я працую па праграме «Да кнігі і чытання праз вольны час і адносіны». У мяне там тры блокі...».

— А яшчэ Святлана Міхайлаўна ідзе ў краму, купляе за свае грошы печыва і цукеркі і ладзіць для дзетак салодкі стол, — дадае Таццяна Караленка.

— І не толькі я, яны таксама прыходзяць са сваімі, — папраўляе Святлана Анікеева. — Мы робім і Спас, і Купалле, і Калядкі...

— Калядкі — гэта любімае мерапрыемства ў нашых дзяцей! — падхоплівае жыхарка Вусця.

Напрыканцы размовы мы задалі пытанне: чым бібліятэка з'яўляецца для сучаснага сяла?

«Скажу менавіта пра нашу тэрыторыю, — пасля невялікага роздуму адказала Святлана Анікеева. — Нехта тут атрымоўвае духоўны пажытак, нехта прыходзіць проста паразмаўляць, адвесці душу. Атрымліваецца, што я і псіхолаг, і... ну не ведаю. Некага трэба і прыструніць». *(Смяецца.)*

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**
*Чавускі раён.*

# ПРАВИЛА проведения Рекламной игры «Смарт-призы от 21vek.by»

Настоящие правила проведения Рекламной игры «Смарт-призы от 21vek.by» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения Рекламной игры «Смарт-призы от 21vek.by» (далее – Рекламная игра).

**1. Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «Триовист» (далее – Организатор).

УНП 190806803.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190806803 решением Минского горисполкома от 22 февраля 2007 года № 339.

Место нахождения Организатора: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й этаж.

Почтовый адрес Организатора: Республика Беларусь, г. Минск, 220020, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й этаж.

Адрес электронной почты: **info@21vek.by.**

**2. Наименование Рекламной игры.**

Наименование Рекламной игры – «Смарт-призы от 21vek.by».

**3. Территория проведения Рекламной игры.**

Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения Рекламной игры.**

Срок начала Рекламной игры: 5 февраля 2020 года;

срок окончания Рекламной игры: 6 апреля 2020 года (включая период розыгрыша и выдачу призов, опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Организатором создана Комиссия по проведению Рекламной игры (далее – Комиссия) в следующем составе:

председатель Комиссии: Писаревский Александр Валентинович, директор по маркетингу ООО «Триовист».

Члены Комиссии:

1. Дехтяр Алина Вадимовна, ведущий юрисконсульт ООО «Триовист»;
2. Калита Юлия Александровна, юрисконсульт ООО «Триовист»;
3. Мишук Ричард Александрович, заместитель руководителя отдела маркетинга ООО «Триовист»;
4. Ганисевская Варвара Сергеевна, юрисконсульт ООО «Триовист»;
5. Порошин Алексей Валерьевич, управляющий ООО «Сандэйз точка бай».

**6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж следующих групп товаров: смартфоны ТМ Apple, смартфоны ТМ Samsung, смартфоны ТМ Huawei, смартфоны ТМ Honor, смартфоны ТМ Xiaomi (далее – Игровые товары), реализуемых в интернет-магазине www.21vek.by.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут быть:

граждане Республики Беларусь, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь;

иностранные граждане, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь;

лица без гражданства, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь.

К участию в Рекламной игре допускаются физические лица, заказывающие, приобретающие или использующие Игровые товары исключительно для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, отвечающие требованиям правил проведения Рекламной игры на условиях, предусмотренных в правилах проведения Рекламной игры.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. К участию не допускаются члены Комиссии.

Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо в срок **с 5 февраля 2020 г. по 2 марта 2020 г. включительно**:

изучить правила проведения Рекламной игры, размещенные на сайте www.21vek.by.

Совершить покупку 1 (одного) или нескольких Игровых товаров на сайте интернет-магазина www.21vek.by, в том числе заполнить форму интернет-заказа (далее – Форма) и указать данные: фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, если таковое имеется); абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно); адрес электронной почты (обязательно), а также подтвердить согласие на участие в Рекламной игре на сайте интернет-магазина www.21vek.by.

После выполнения вышеперечисленных условий покупатель становится Участником Рекламной игры и ему присваивается Игровой код.

Игровой код присваивается Участникам по дате и времени оплаты стоимости Игрового товара. В случае совпадения даты и времени оплаты стоимости товаров Игровой код присваивается в алфавитном порядке согласно фамилии, имени и отчества Участника Рекламной игры.

Для участия в Рекламной игре достаточно приобрести один Игровой товар. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз. При этом для получения очередного Игрового кода Участнику необходимо оформить новый заказ с наличием в нем хотя бы одного Игрового товара.

Фактом покупки (оплаты) товара в интернет-магазине **www.21vek.by** является факт выдачи продавцом кассового и/или товарного чека в момент передачи товара покупателю. Данные правила применяются и при осуществлении покупателем покупки с оплатой товаров «онлайн» при получении покупателем документа, подтверждающего оплату товара.

**8. Призовой фонд Рекламной игры.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора.

Призовой фонд состоит из Призов, общее количество которых составляет **11 единиц (штук), общий размер призового фонда составляет 6201,24 бел. руб.**:

| № | Наименование приза | Название приза | Количество, шт. | Цена, бел. руб., 1 шт. | Общая сумма, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Смартфон Apple iPhone 11 64GB Green, Model A2221, MWLY2RM/A | «Приз 1» | 1 | 1994,40 | 1994,40 |
| | Денежные средства в размере 278,44 бел. руб. | | 1 | 278,44 | 278,44 |
| 2 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | «Приз 2» | 10 | 358,80 | 3588,00 |
| | Денежные средства в размере 34,04 бел. руб. | | 10 | 34,04 | 340,40 |

Каждый Участник может выиграть неограниченное количество Призов в рамках Рекламной игры.

**9. Место, дата, время и порядок проведения Розыгрышей Призового фонда. Порядок определения победителей.**

Розыгрыши Призов состоятся по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й этаж.

Даты и время проведения Розыгрышей:

| № Розыгрыша | Дата и время проведения | Участвуют Участники, выполнившие условия, указанные в п. 7 настоящих правил в период с … по … | Наименование разыгрываемых Призов | Количество разыгрываемых Призов, шт. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 20.02.2020 года, 16.00 | с 05.02.2020 по 17.02.2020 (включительно) | «Приз 2» | 5 |
| 2 | 05.03.2020 года, 15.00 | с 18.02.2020 по 02.03.2020 (включительно) | «Приз 2» | 5 |
| 3 | 05.03.2020 года, 16.00 | с 05.02.2020 по 02.03.2020 (включительно) | «Приз 1» | 1 |

Розыгрыши Призов проводятся открыто с возможностью присутствия Участников Рекламной игры.

За ходом Розыгрышей призового фонда следит Комиссия.

Розыгрыши производятся в следующем порядке.

К моменту Розыгрышей призов данные об Участниках Рекламной игры формируются в список Игровых кодов Участников (далее – Список) с указанием игрового кода, фамилии, имени, отчества (при наличии), абонентского номера мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате, адреса электронной почты, даты совершения оплаты заказа.

